I-б. "Савецкая Беларусь"
Москва, Моховая, 6 Публичная
библиотека СССР им. Ленина
отд. обмен. адвін экз.

Пролетарыі ўсіх краёў, аднаўчайцеся!

Proletarier aller Länder, vereinigt euch!

Pracujący wszystkich krajów, łączcie się!

Единяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня
Штодзённая газэта

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ САВЕТАЎ РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ І САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ С. С. Р.

НЯДЗЕЛЯ
29 лістапада 1931 г.
№ 275 (3364)

За сацыялістычную жывёлагадоўлю!

БССР зьяўляецца адным з важнейшых жывёлагадоўчых раёнаў СССР. Таму праблема разьвіцьця сацыялістычнай жывёлагадоўлі і асабліва сьвінагадоўлі зьяўляецца актуальнейшай праблемай для БССР.

Як і ва ўсім Саюзе, і ў БССР за апошні год дасягнуты значныя посьпехі ў справе разьвіцьця сацыялістычнай жывёлагадоўлі. Аб гэтым з ўсёй яскравасьцю пацьвердзілі лістападаўкі аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б. Аднак, гэтыя посьпехі зьяўляюцца толькі першымі крокамі ў барацьбе за вырашэньне жывёлагадоўчай праблемы. Як канстатаваў пленум «задачы фарсаванага разгортваньня жывёлагадоўлі яшчэ ня сталі ў цэнтры штодзённай увагі партыйных, савецкіх, земельных і калгасных каапэрацыйных арганізацый». Да гэтага часу яшчэ не разгорнута па-сапраўднаму, па-бальшавіцку барацьба за поўнае і своячасовае выкананьне плянаў па жывёлагадоўлі, за палепшаньне якасных паказьнікаў, барацьба са стратамі, ня створана яшчэ належная кармовая база. Да гэтага часу яшчэ недавальняюча праходзіць камплектаваньне саўгасных і калгасных фэрм, будаўніцтва абораў і сьвінарнікаў. Не разгорнута таксама ўсім камплектаваньне птушкаводных і трусаводных калгасных і саўгасных таварных фэрм.

Аб'яднаны пленум даў вельмі чоткія і зусім канкрэтныя дырэктывы аб далейшым разьвіцьці сацыялістычнай жывёлагадоўлі ў БССР і ў першую чаргу аб ліквідацыі ў бліжэйшы тэрмін маючыхся прарываў на гэтым важнейшым і адказьнейшым вучастку работы. Перш за ўсё пленум падкрэсьліў неабходнасьць палкам выканаць намечаныя па разьвіцьці сацыялістычнай жывёлагадоўлі планы 1931 году, ліквідацыі прарываў, маючыхся на гэтым фронце і падрыхтоўкі да складаньня кантрольных лічбаў па жывёлагадоўлі на 1932 г. У цэнтр увагі всіх партарганізацый, земорганаў, саўгасаў і калгасаў сыстэмы павінна быць пакладзена задача фармаваньня статку жывёлагадоўчых саўгасаў, МТФ, СТФ, птушкаводных і трусаводных гаспадарак. Неабходна весьмі рашучую барацьбу з забоем маладняка і падзяжом парасят, разгарнуць шырокую работу на зьнішчэньні ялавасьці кароў і сьвіней.

Асабліва значэньне мае выкананьне пастановы ЦК і СНК аб народным раёнаваньні па жывёле. Гэтай справе не ўдаецца належнай увагі з боку не вторых арганізацый, і таму пленум даў дырэктыву ў месячны тэрмін скласьці сетку племянных баз і гадавальнікаў на БССР у адпаведнасьці з народным раёнаваньнем. Яшчэ да гэтага часу ў радзе месц маецца недацэнка каня, у сувязі з чым ёсьць выпадкі разбазараваньня коняй. Выходзячы з таго, што конская цягавая сіла ў народнай гаспадарцы мае вялізарнае значэньне, пленум зваструў увагу на выкананьні дырэктыў партыі і ўраду аб разьвіцьці ў БССР конягадоўлі і рашучай барацьбы разам з тым з разбазараваньнем конскага пагалоўя.

У галіне сацыялістычнай жывёлагадоўлі асабліва значэньне мае барацьба са стратамі ў саўгасах і калгасах, МТФ і СТФ. Гэта адбываецца таму, што яшчэ не замацаваны сталыя кадры работнікаў на аборах і сьвінарніках, яшчэ не ліквідаваны абязьлічка і ўраўнілаўка ў рабоце па даглядзе жывёлы. Гэта павінна быць зьнішчана самым рашучым чынам. Пленум патрабуе ад партыйных і гаспадарчых арганізацый правядзеньня шырокіх прафіляктычных мерапрыемстваў, укамплектаваць аборы, сьвінарнікі лепшымі ўдарнікамі-калгаснікамі і рабочымі саўгасаў, рашуча зьнічыць абязьлічку, палепшыць умовы для работы сьвінароў, сьвінарак, даярак скотнікаў і пастухоў, ад якіх узначнай ступені залежыць выканань не плянаў выхаду і якасьці таварнай прадукцыі. Неабходна перавесьці работу па даглядзе за жывёлай на зьдзельна-прэм'яльную сыстэму, вызначыць мерапрыемствы па стымуляваньні разьвіцьця жывёлагадоўлі, асабліва сьвіней, шляхам устанаўленьня раду дадатковых ільгот для жывёлагадоўчых і асабліва сьвінагадоўчых калгасаў, укараніць сыстэму прэм'яваньня ў жывёлагадоўчых калгасах і саўгасах, стварыўшы для гэтай справы 500-тысячны прэм'язальны фонд.

Стварэньне кармовай базы—неабходная ўмова пасьпяховасьці разьвіцьця сацыялістычнай жывёлагадоўлі. Таму пленум з усёй рашучасьцю падкрэсьліў неабходнасьць стварэньня моцнай кармовай базы для жывёлагадоўлі шляхам падвышэньня ўраджайнасьці палявых культур, арганізацыі штучных зыпасаў, палепшаньня сенажацяй, пашырэньня пасеву кармовых траў і кораньплодаў. Асабліва значэньне мае падвышэньне ўраджайнасьці, што зьяўляецца цэнтральнай задачай у стварэньні кармовай базы. На вырашэньне гэтых задач партарганізацыі павінны сканцэнтраваць сваю ўвагу.

Мэханізацыя саўгасаў і калгасаў зьяўляецца адным з асноўных мерапрыемстваў па хутчэйшым выкананьні плянаў жывёлагадоўлі. Пленум даў дырэктыву аб мэханізацыі ў 1932 годзе цэлага раду працэсаў у галіне жывёлагадоўлі. Прамысловасьць павінна выпусьціць пэўную колькасьць машын і абсталяваньня для мэханізацыі калгасаў і саўгасаў.

У нас дрэнна абстаіць справа з буцаўніцтвам у жывёлагадоўчых сацыялістычных гаспадарках. Тут мы маем значныя прарывы. Трэба неадкладна зьнічыць гэтыя прарывы, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на якасьць будаўніцтва і зьніжэньне кошту. Трэба зараз-жа прыступіць да складаньня плянаў будаўніцтва жывёлагадоўчых калгасаў і саўгасаў на 1932 г., прыступіць да практычнага разгортваньня гэтага будаўніцтва, ні ў якім разе не спыняючы яго і на зімовы час. Райкомы павінны ўзяць пад свой непасрэдны нагляд будаўніцтва ў жывёлагадоўчых калгасах і саўгасах.

У нас дзе-ні-дзе існуюць у саўгасах, МТС і калгасах шкодныя кулацка-капіталістычныя тэндэнцыі аб тым, каб спачатку забясьпечыць цалкам свае патрэбы, а пасьля ўжо здаваць (прадаваць) дзяржаве таварную прадукцыю. Неабходна разгарнуць рашучую барацьбу за поўнае і своячасовае выкананьне плянаў па здачы (продажу) гаспадаркамі сацэктару та гарнай прадукцыі.

Як і раней востра стаіць пытаньне з забясьпечаньнем кадраў для жывёлагадоўчай сацыялістычнай гаспадаркі. Пленум прапанаваў правесьці поўны вучот агра і воазэт-спэцыялістаў, працуючых у апаратах савецка-гаспадарчых арганізацый, перакінуць частку іх з апаратаў непасрэдна на вытворчасьць, палепшыць матар'яльна-бытавыя ўмовы. Пленум даў дырэктыву па падрыхтоўцы і ўзмацненьні гаспадарак сацэктару партыйнымі кадрамі, якія-б маглі забясьпечыць работу і кіраўніцтва па-новаму і на падставе практычнага ажыцьцяўленьня шасьці ўмоў тав. Сталіна перанесьці цэнтр партработы непасрэдна ў нізавое зытворчае зьвяно (цэх брыгаду, фэрму, аддзяленьне).

«Важнейшай і рашаючай задачай усіх камуністаў, якія працуюць у галіне жывёлагадоўлі, зьяўляецца сапраўднае аўладаньне тэхнікай жывёлагадоўчай справы». Гэта дырэктыва пленуму зьяўляецца важнейшай і абавязковай для кожнага камуніста ў жывёлагадоўчых гаспадарках сацэктару.

Калектыўная гаспадарка поўнасьцю і цалкам забясьпечвае вялізарныя магчымасьці разьвіцьця высокатаварнай жывёлагадоўлі.

Задача арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, як цэнтральная на даным этапе калгаснага будаўніцтва, стаіць перад усімі жывёлагадоўчымі гаспадарками сацэктару неабходнасьць забясьпечыць большы таварны выхад прадукцыі, ад жывёлагадоўлі, большую канцэнтрацыю та варнага статку, рашучае павялічэньне ўдойнасьці кароў і выхад таварных сьвіней, рашучую неадкладную ліквідацыю абязьлічкі і сапраўднае ўвядзеньне зьдзельшчыны.

Барацьба за сацыялістычную жывёлагадоўлю сустракае шалёнае супраціўленьне кулацтва, якое ўсімі мерамі і сродкамі імкнецца перашкодзіць, затармазіць вырашэньне важнейшай для БССР задачы. Бязьлітасная барацьба з кулацтвам і яго агентурай—правымі і «левымі» апартуністамі, барацьба за генэральную лінію партыі забясьпечыць выкананьне пастаноў пленуму аб разьвіцьці сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

Першы ўсебеларускі зьезд калгасьніц

Дзеньнік зьезду

27 лістапада васьля абедзенага перапынку па 3-м пытаньні—аб разьвіцьці сацыялістычнай жывёлагадоўлі выступіў з дакладам упаўнаважаны «Сьвінаводцэнтру» тав. Красоўскі.

Пасьля дакладу на гэтым пытаньні, разгарнуліся спрэчкі.

⊙ Бядняцка-аднаасобніца Саснова Ганна (Ельскі раён) з трыбуны вітаючы зьезд падала заяву аб уступленьні ў калгас. Зараз добра пераканаўшыся, ўбачыла,—гаворыць т. Саснова—як актыўныя жанчыны калгасніцы змагаюцца за перабудову сельскай гаспадаркі; падаючы заяву аб прыняцьці мяне ў калгас, абавязваюся працаваць па-ўдарнаму.

⊙ Калгасьніца Сьмірнова (Заходняя вобласьць) ад 400 членаў камуны імя Парыскіх камунараў перадала вьезду бальшавіцкае прывітаньне.

— Па нашым раёне (Смаленскі раён) праблема жывёлагадоўлі—гаворыць т. Сьмірнова—вырашаецца па-ўдарнаму. У нашай камуне правільна наладжан даглядзе за маладняком, дзякуючы чаму адыход маладняка зведзен да мінімуму. Для лепшай арганізацыі работы на фэрмах, камсамольская і партыйная ячэйкі вылучылі лепшых таварышоў, якія дамагліся гэтых перамог.

⊙ Тав. Рабінович (кіраўнік інстытуту сьвінагадоўлі) у сваім выступленьні падрабязна спыніўся на задачах калгасу ў галіне маладняка.

— Правільнае вырошчваньне і наладжаны даглядзе за маладняком—гаворыць т. Рабінович—зьяўляецца асноўнай задачай ў вырашэньні пытаньня разьвіцьця жывёлагадоўлі. Маладняк павінен мець для зімы добрае і цёплае памяшканьне, высокаякасны корм, што дасьць магчымасьць захаваць маладняк ад хваробы і г. д.

***

На ранішнім пасяджэньні 28 лістапада, працягваўся спрэчкі па дакладу т. Красоўскага.

⊙ Калгасьніца тав. Позьняк (нацыянальны калгас «Чырвоны Кастрычнік», Койданаўскі раён) гаворыць вьезду аб перамозе калгасу ў пытаньні разьвіцьця сацыялістычнай жывёлагадоўлі. Калгас «Чырвоны Кастрычнік» мае птушкаводную фэрму, якая цалкам укамплектавана і забясьпечана на зіму памяшканьнем.

⊙ Зразумеўшы ролю партыі ў галіне калгаснага будаўніцтва—гаворыць т. Занічэвіч М. (Койданаўскі раён)—падаю заяву аб прыняцьці мяне ў рады камуністычнай партыі бальшавікоў.

⊙ Калгасьніца Давідоўская (камуна «Зьвязда», Пухавіцкага раёну) ад імя камунараў перадае рапарт аб перамогах камуны ў разьвіцьці сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

— Нам трэба было паставіць 80 галоў рагатай жывёлы—кажа т. Давідоўская—а мы паставілі 85. Плян сілаваньня перавыканалі.

⊙ Тав. Таманская (камуна «Кастрычнік», Лагойскі раён) унесла прапанову выклікаць на сацспаборніцтва па лепшым выкананьні плянаў укамплектаваньня, будаўніцтва, арганізацыю работы на фэрмах у жывёлагадоўчых калгасах і саўгасах,—калгасы Украіны. Пад гучныя воплескі прымаецца прапанова т. Таманскай.

⊙ Зьезд вітала дэлегацыя ад канфэрэнцыі пралетарскага студэнцтва. Тав. Воранаў перадаў шчырае бальшавіцкае прывітаньне дэлегатам 1-га Ўсебеларускага зьезду.

— Тыя веды, якія мы атрымалі—кажа т. Воранаў—мы непасрэдна перанясем да вас у калгасы.

⊙ Калгасьніцы Салаўёва і Дзямідовіч—дэлегаты зьезду падалі заяву аб прыняцьці ў рады ленінскай партыі.

⊙ Зьезд вітала дэлегацыя ад канфэрэнцыі МенАПП.

⊙ — Калгас Энгельса (Уваравіцкі раён)—гаворыць т. Васіленка,—мае буйную жывёлагадоўчую фэрму з ліку 555 кароў. Дагляд за жывёлай пастаўлен досыць добра. Корм выдаецца па строга вызначаных нормах. Калгас пабудаваў два кароўнікі на 400 галоў буйнай рагатай жывёлы. За лепшыя паказьнікі нашай работы, мы атрымалі прэмію—трактар і тэлефонную сувязь.

⊙ Тав. Багушэўскі (упаўнаважаны кролікацэнтру) зваструе ўвагу дэлегатаў зьезду аб ролі разьвіцьця дробнай жывёлагадоўлі ў жывёлагадоўчых калгасах і саўгасах.

— Трусаводзтва,—гаворыць т. Багушэўскі,—адна з галін разьвіцьця жывёлагадоўлі, якая ў значнай меры вырашае мясную праблему. Але на вялікі жаль у нас у гэтай рабоце маецца рад прарываў. Так, нам патрэбна было арганізаваць 20 трусаводных фэрм, на апошні-ж час арганізавана толькі 7. Да канца гэтага месяца ў нашых фэрмах павінна быць пастаўлена 15.000 трусоў. За гэтыя баявыя задачы ў разьвіцьці трусаводзтва павінен па-бальшавіцку біцца кожны калгас, кожная калгасьніца—ударніца.

⊙ Калгасьніцы Саковіч В., і Бухарэнка падалі заяву аб прыняцьці ў партыю Леніна.

⊙ Тав. Рачыцкі (старшыня НКЗБ) з трыбуны зьезду вітаў дэлегатаў 1-га Ўсебеларускага зьезду жанчын-калгасьніц. Тав. Рачыцкі ў сваей прамове зарастрае асаблівую ўвагу на арганізацыі працы ў калгасах, асабліва ў жывёлагадоўчых і сьвінаводчых фэрмах.

Ерыгадзіра Прыцава Гарпіна

(З стэнаграмы ў часе перапынку)

— Гэта было ў пачатку 1927 году, калі я яшчэ была бядняцкай аднаасобніцай,—апавядае калгасьніца калгасу «Расьсьвет Пераможца» (Жлобінскага раёну) тав. Прыцава Гарпіна. У гэтым-жа годзе ў нашай вёсцы арганізаваўся калгас. Я першая з сям'ёй уступіла ў гэты калгас. З таго часу мінула 4 гады. Чатыры гады, як я па-новаму пачала працаваць, па-новаму жыць. Ранейшае—гэта толькі ўспаміны, а зараз... зараз ёсьць шмат аб чым гаварыць.

1 Прыцава апавядае аб ударных тэмпах барацьбы за выкананьне калгаснага пляну, за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасу.

— Жалі жыта,—гаворыць т. Прыцава. Тры брыгады, у тым ліку і наша, былі цалкам перакінуты на жніва да поўнага сканчэньня гэтай работы. Нас паставілі на 1 га 10 чалавек і тут наша брыгада была першай. Мы ў дзесяцярох за два дні выканалі норму, якая давалася на чатыры дні.

Другая брыгада адставала. Сорамна нам было за яе. Бывала брыгадзір другой брыгады тав. Купцова гаворыць: «як выйсьці першымі, дапамажэце нам падцягнуцца». Мы іх узялі на грамадзкі буксір, выклікалі на сацспаборніцтва і ўсе астатнія брыгады.

Дэлегатка зьезду калгасьніца Шэндарава Агапа (66 год) (Шклоўскі раён).

Далей выбіралі бульбу,—нас паставілі выбіраць з пад плуга 15 чалавек. І ў гэтай рабоце наша брыгада таксама перавыканала нормы выпрацоўкі. Уборка бульбы ў калгасе была скончана раней тэрміну.

Дэлегатка зьезду Прыцава Гарпіна

Тав. Прыцава зьяўляецца адной з лепшых ударніц калгасу. За год яна выпрацавала больш як 303 працадні. Ніводнага прагулу і спазьненьня на работу ня было.

— Нават бывала адчуваеш сябе дрэнна,—гаворыць тав. Прыцава,—здаецца ня можаш працаваць, але калі ўбачыш, што ўсе калгасьнікі, як адзін, ідуць дружна на работу, неяк няпрыемна застацца. Разьмяркоўвалі ўраджай выключна па працоўным цыкляпу «хто больш і лепш працаваў, той больш і атрымаў». Калгас «Расьсьвет Пераможца» пасьпяхова выконвае свае абавязкі перад дзяржавай па здачы сваіх лішкаў дзяржаве.

Усе работы ў калгасе ў асноўным скончаны. Закончваем апрацоўку і здачу лёну.

Праўленьне калгасу пад кіраўніцтвам партыйнай ячэйкі паставіла ў цэнтр штодзённай сваёй работы арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасу.

Паўсямеснае наступленьне Японіі ў Манчжурыі

АБВАСТРЭНЬНЕ БАРАЦЬБЫ ЗА ПАДЗЕЛ КІТАЮ. АПЭТЫТЫ ФРАНКА-АМЭРЫКАНСКА-АНГЕЛЬСКАГА ІМПЭРЫЯЛІЗМУ РАЗГАРАЮЦЦА

Захопленую Манчжурыю японскі імпэрыялізм на ўступіць нікому

Завярэньне аб „міралюбнасьці" і далейшы наступ

ТОКІЁ, 27-XI. Прадстаўнік японскага міністэрства замежных спраў, наперакор паведамленьням з Мукдэну, сьцьвярджае, што перасоўваньне японскага войска ў бок Цзіньчжоў не азначае пачатку наступленьня з мэтай захопу гэтага гораду. Прадстаўнік міністэрства замежных спраў дадаў, што «у выпадку ўзяцьця Цзіньчжоў урад будзе прымушаны падаць у адстаўку, паколькі ўрад даў абавязацельства ня весьці наступленьня на Цзіньчжоў. Узяцьце Цзіньчжоў азначала-б, супярэчнасьць таму, што прадстаўнік міністэрства замежных спраў паведаміў, што Іосізава афіцыйна прасіў Брыяна, каб ён запрапанаваў Кітаю эвакуаваць войска з Цзіньчжоў з тым, каб у раёне Цзіньчжоў—Шанхайгуань не засталося ніякага войска.

Японскае войска нібыта ня зойме гэты раён, які застанецца пад кіраўніцтвам мясцовай кітайскай улады і паліцыі. Аднак, у выпадку пагрозы японскім рэзыдэнтам, японскае войска будзе мець права перайсьці ў гэты раён, напрыклад, з мэтаю аказаньня дапамогі японскаму войску ў Цяньдзіне, калі становішча там пагоршыцца.

Міністр замежных спраў Сідэхара сёньня паўтарыў гэтую прапанову французкаму паслу ў Японіі Мартэлю і падкрэсьліў, што аб ўвядзеньні войска нэўтральных дзяржаў у гэты раён ня можа быць і гутаркі».

Бэйпін на ваенным становішчы

ШАНХАЙ, 27-XI. З прычыны распаўсюджваньня чуткаў, што ў Бэйпін прыбыла японскія вайсковыя, апранутыя ў вольную вопратку, мясцовая ўлада абвясьцила горад на ваенным становішчы, забараніўшы хаджэньне па вуліцах пасьля 6 гадзін увечары.

Чарговы ўльтыматум

ШАНХАЙ, 27-XI. «Чайна-прэс» паведамляе, што напярэдадні сутычкі паміж японскім і кітайскім войскам у Цянлзы выбухнула паўстаньне перапранутых у зольнае аддзеньне японцаў пад камандаваньнем палкоўніка Доіхара. Японцы прызезьлі з сабой кулямёты. У бойцы ўдзельнічала таксама японскае войска. Бойка працягвалася 15 гадзін. Кітайцы панесьлі вялікія страты.

Японскі консул уручыў кітайскай уладзе ультыматыўнае патрабаваньне вывесьці войска. У ўльтыматуме зазначаецца, што калі ня будзе выканана пказаннае патрабаваньне, а таксама прылушаны ўсякія анты-японскія выступленьні—гэта будзе разглядацца як выклік па адрасе Японіі. На японскай канцэсіі абвешчана ваеннае становішча. Чужаземнае войска ў Цзяньзіне прыведзена ў баявую гатоўнасьць.

„Толькі пад уладай Японіі"

ТОКІЁ, 27-XI. Старшыня мукдэнскага ўраду Юань-Цзінь-кай (японскі стаўленьнік) у інтэрв'ю з мукдэнскім прадстаўніком агенцтва Сімбун рэнго пацьвердзіў папярэднія весткі аб намеры ўраду Юань-Цзінь-кая стварыць у Манчжурыі «канстытуцыйную манархію».

Юань-Цзінь-кай сказаў, што адзіным магчымым кандыдатам на прэстол можа быць толькі Пу-І. Юань-Цзінь-кай лічыць, што «моцная Манчжурыя магчыма толькі пры ўмове супрацоўніцтва з Японіяй».

Пэратварэньне Аўстрыі ў калёнію

ВЕНА, 27-XI. Сюды прыбылі прадстаўнікі замежных крэдытораў, у тым ліку дырэктар ангельскага банку, прэзыдэнт фінансавага камітэту Лігі нацый, у сувязі з пагражаючым з боку Аўстрыі спыненьнем плацяжоў у ліку пагашэньня замежных патрабаваньняў, якія ацэньваюцца ў 400 млн. шылінгаў (каля 140.000.000 руб.).

Як паведамляюць з асьвядомленых колаў, прадстаўнікі замежных крэдыторaў патрабавалі ад аўстрыйскага ўраду большасьць месц у кіраўніцтве Крэдытанштальта (буйнейшага аўстрыйскага банку, які абанкруціўся ў маі 1931 г. і «аздараўляецца» зараз аўстрыйскім урадам), а таксама ад генэральнага дырэктара гэтага банку.

Газэты паведамляюць аб плянах распродажу аўстрыйскай прамысловасьці чужаземцам, зазначаючы, што надыходзіць час «канчатковай калёнізацыі Аўстрыі замежным капіталам».

«Ротэ фанэ» зазначае, што гэта будзе азначаць пэратварэньне Аўстрыі ў аддзін з пляцдармаў падрыхтоўкі імпэрыялістычнай інтэрвэнцыі супроць Савецкага Саюзу.

Масавыя забастоўкі пратэсту

Супроць расстрэлу дэманстрацыі рабочых

ПРАГА, 27-XI. Па ўсёй краіне расьце хваля рабочага абурэньня ў сувязі з крывавым падзеямі ў Фрэйвальдаў. Рад новых фабрык і заводаў далучыўся да стачак пратэсту. Бязупынна наступаюць шматлікія рэзалюцыі пратэсту, прынятыя на агульных заводзкіх сходах.

Рабочыя патрабуюць роспуску ўрадавай сьледчай камісіі, у якой прымае ўдзел таксама і жандармскі генэрал і ўтварэньня новай камісіі з прадстаўнікоў рабочых.

Рабочыя раёну Фрэйвальдаў пастанавілі працягнуць усеагульную забастоўку пратэсту аж да дню пахаваньня ахвяр паліцэйскага расстрэлу.

Пралетарыят Францыі стварае фонд барацьбы

ПАРЫЖ. Камфракцыя рашыла стварыць у 1 мільён франкаў фонд на пакрыцьцё выдаткаў па агітацыйнай кампаніі ў сувязі з праходзячымі выбарамі ў маі ў парлямант. Покліч кампартыі сустрэў жывы водгук на ўсіх прадпрыемствах.

РОСТ „ЗАХОДНЯЙ КУЛЬТУРЫ"...

або „зялёнай банды"

1. «Ніхто не павінен нічога купляць у яўрэйскіх крамах, не прадстаўляць работы яўрэйскім рабочым і рамесьнікам, не зьвяртацца за парадамі да яўрэйскіх дактароў і адзакатаў.

2. Калі ў якім-небудзь таварыстве або арганізацыі, да якой вы належыце ёсьць яўрэі, вы павінны настойваць на тым, каб іх адтуль выкінулі.

3. Змагаючыся супроць яўрэяў, вы павінны прапагандаваць салідарнасьць інтарэсаў усіх палякаў бяз розьніцы клясаў і палітычных перакананьняў. Зараз, калі тысячы палякаў без работы і церпяць ад голаду, кожны грош, які трапіць да яўрэяў,—злачынства перад польскім народам».

„Рабочым рукамі будуецца новы сьвет"

Бернард Шоу аб СССР

ВЕНА, 26-XI. «Нейе Фрэе Прэссэ» зьмяшчае артыкул вядомага нямецкага перакладчыка Трэбіча, у якім апошні перадае ўражаньне аб сваім нядаўнім спатканьні з Бэрнардам Шоу. Пазоўле слоў Трэбіча, галоўнай тэмай іх гутаркі быў СССР, прычым Шоу праявіў крайняе захапленьне СССР. Шоу лічыць, што «СССР вытрымаў прыкладны іспыт на разьвязаньне эканамічнага крызісу».

Трэбіч да гэтага дадае: «энтузіязм пісьменьніка стане ўпаўне зразумелым, калі прыняць пад увагу, што ён прыехаў з краіны беспрацоўя ў краіну дзе ліквамункава рабочымі рукамі будуецца новы сьвет. Іде сярод пустэчы і стэпаў проста ўзьнікаюць новыя сёлы і новыя гарады».

Атака капіталістаў адбіта

БЭРЛІН, 27-XI. Забастоўка тэкстыльшчыкаў у Мітвайгу (Саксонія), праведзеная пад кіраўніцтвам рэвалюцыйнай прафапазыцыі супроць 5-процантнага зьніжэньня заработку, закончылася поўнай перамогай рабочых; прадпрыемцы змушаны былі адмовіцца ад сваіх патрабаваньняў.

Сацыял-фашыст кандыдат у будучы „нацыянальны ўрад"

ПАРЫЖ. Француская прэса і палітычныя колы аддаюць многа ўвагі адноўленаму «Папюлер» абмену лістамі паміж Поль Банкурам і сакратаром французкай сацыялістычнай партыі Поль Форам. Банкур паведамляе ў лісьце Фору аб сваім рашэньні запісацца ў сэнаце, куды ён нядаўна быў абраны, у групу незалежных беспартыйных, членам якой зьяўляецца, паміж іншым, Лаваль. Адначасова Банкур запэўняе ў сваёй «вернасьці сацыялістычным ідэалам», падкрэсьліваючы, аднак, што ў бліжэйшыя месяцы на першым пляне будуць стаяць палітычныя пытаньні, па якіх погляды большасьці сацыялістычных партый «разыходзяцца з поглядамі, якія Банкур абараняў у Жэнэве ў якасьці дэлегата Францыі».

«Папюлер» не камантуючы лістаў Поль Банкура зьмяшчае толькі адказ Поль Фора, абмяжоўваючагася жалем, што партыя пазбаўляецца настолькі заслужанага члена». Заўважаючы, што Банкур ідзе па кроках Сноўдэна, фашысцкая «Амі Дю Пэпль» падкрэсьлівае, што Банкур будзе лепшым прыемнікам Лаваля, у выпадку, калі апошні пойдзе ў адстаўку. У парыскіх палітычных колах называюць Банкура адным з кандыдатаў на пасаду міністра замежных спраў.

Пастанова Камісіі Выкананьня пры СНК БССР

пра ход першапачатковай апрацоўкі лёну і канапель і будаўніцтва ільняных заводаў першай чаргі

Выслухаўшы даклады Нам. Народнага Камісара Земляробства тав. Паніматка, Старшыні Белкалгасцэнтру таварыша Міцькова, дырэктара Беллёнапянькатрэсту тав. Кандраля і Нам. Кіраўніка Беллёнаканапляводбуду таварыша Капароўскага Камісія Выкананьня пры СНК БССР устанаўляе:

1. Пастанова Эканамічнага Савету БССР за 21-IX-31 г. «Пра становішча падрыхтоўкі да першапачатковай апрацоўкі лёну і канапель» (З. З. БССР 1931 г., Аддзел II, № 31, паст. 313), а таксама пастанова ЦК КП(б)Б за 4-XI-31 г. «Пра першапачатковую апрацоўку лёну і канапель, здачу таварнай прадукцыі і будаўніцтва ільнозаводаў» ня выкананы ў выніку чаго:

а) заводзкая і асабліва незаводзкая першапачатковая апрацоўка лёну і канапель амаль зусім не разгорнута (на 20-XI-31 г. лёну прамята 19,2 процанты, пратропана 9,1 проц., канапель прамята 4,9 проц., пратропана 2,6 процантаў);

б) ня поўнасьцю выканан плян арганізацыі новых сушыльна - мяльна-трапальных пунктаў, зусім нездавальняюча праходзіць рамонт існуючых пунктаў, не арганізаваны перасовачныя мяльна - трапальныя абозы, машыны на пунктах працуюць ня поўнай нагрузкай;

в) на 15 лістапада плян загатовак трасты ільнянымі заводамі выканан на 24,8 проц., а ільняной саломы на 27,3 проц.;

г) зусім дрэнна выконваецца плян лёназагатовак, асабліва ільнянога валакна (выканана на 15-XI-31 г. 6,3 проц. агульнага пляну);

д) будаўніцтва ільняных заводаў першай чаргі сарвана. З вызначаных для пуску да 1-XI-31 г. 18 ільняных заводаў ні адзін завод ня здан у эксплёатацыю.

2. Адказнасьць за зрыў выкананьня дырэктыў ЦК і СНК па першапачатковай апрацоўцы тэхнічных культур, здачы прадукцыі і будаўніцтву ільняных заводаў нясуць:

а) Народны Камісарыят земляробства, у асобе т. Вараб'ёва, які не ўста навіў сыстэматычнага штодзённага кантролю за поўным выкананьнем адпаведнымі рэспубліканскімі арганізацыямі і раённымі зямельнымі аддзеламі пастаноў ЦК і СНК;

б) Белкалгасцэнтр, у асобе т. Шкурдзе і Бел. аддзяленьня Трактарацэнтру, у асобе т. Каршакевіча, якія не наладзілі належнага апэрацыйнага кіраваньня раённымі арганізацыямі і машынна - трактарных станцый несправе своячасовай арганізацыі першапачатковай апрацоўкі лёну і канапель і здачы (продажу) дзяржаве таварнай прадукцыі, а таксама ня выканалі дырэктыў аб арганізацыі новых і рамонту існуючых мяльна-сушыльна - трапальных пунктаў і арганізацыі перасовачных мяльна - трапальных абозаў;

в) Белсельснаб, у асобе т. Талапіла, які ня ўжыў рашучых захадаў да своячасовага завозу льномялак і льно трапалак, згодна зацьверджанага СНК пляну;

г) Лёнаканаплябуд, у асобе т. Паляка, які не забясьпечыў належнага апэрацыйнага кіраваньня будаўнічымі вучасткамі, да ўстаноўленых тэрмінаў ня скончыў будаўніцтва вытворчых карпусоў і не скарыстаў усіх мясцовых магчымасьцей для своячасовага забясьпечаньня трасьмісійным і іншым абсталяваньнем ільняных заводаў першай чаргі;

д) раённыя выканаўчыя камітэты, раённыя калгассаюзы і машына-трактарныя станцыі, якія недастаткова мабілізавалі калгаснікаў і бядняцка-сераднякоўскія масы насельніцтва на выкананьне пляну першапачатковай апрацоўкі лёну і канапель і здачы прадукцыі да ўсіх калгасаў, не арганізавалі ўсяе работы па першапачатковай апрацоўцы лёну і канапель на аснове зьдзельшчыны, а таксама ня ўжылі рашучых захадаў да своячасовага спагнаньня з кулацка - заможных гаспадарак ільнянога семя, валакна і пянькі.

Выходзячы з гэтага Камісія Выкананьня пастанаўляе:

1. Абавязаць Белкалгасцэнтр пад адказнасьць т. Міцькова, Бел. аддзяленьне Трактарацэнтру пад адказнасьць тав. Каршакевіча, Беллёнапянькатрэст, пад адказнасьць т. Кандраля, раённыя выканаўчыя камітэты, раённыя калгассаюзы і дырэктароў Машынна - трактарных станцый неадкладна разгарнуць работу для поўнага ажыцьцяўленьня пастаноў Эканамічнага Савету БССР за 21-IX-31 г. і ЦК КП(б)Б за 4-XI-31 г. у справе выкананьня пляну першапачатковай апрацоўкі лёну і канапель і здачы таварнай прадукцыі, устанавіўшы чоткае апэрацыйнае кіраваньне гэтаю работаю.

Даручыць НК РСІ і Народнаму Камісарыяту Земляробства праводзіць сыстэматычны кантроль за работаю паказаных рэспубліканскіх і раённых арганізацый па выкананьні гэтай пастановы.

2. Абавязаць Народны Камісарыят Земляробства, Белкалгасцэнтр, Бел. аддзяленьне Трактарацэнтру, Беллёнапянькатрэст, Снабжэньня, пад адказнасьць т. Розіна, Белкалгасцэнтр, Бел. аддзяленьне Трактарацэнтру і раённыя выканаўчыя камітэты, пад адказнасьць старшынь забясьпечыць поўнае выкананьне гадавога пляну загатовак ільнянога валакна і пянькі не пазьней наступных тэрмінаў: ільнянога валакна не пазьней 1 сакавіка 1932 г., пянькі не пазьней 1 красавіка 1932 г.

Прапанаваць раённым выканаўчым камітэтам ужыць самыя рашучыя захады да неадкладнага спагнаньня з кулацка - заможных гаспадарак ільнянога валакна і пянькі.

3. Улічваючы факты абязьлічваньня і няправільнага скарыстаньня фонду прэміраваньня здатчыкаў ільнянога валакна і пянькі, абавязаць Народны Камісарыят Снабжэньня пад адказнасьць тав. Красоўскага і Белкаапсаюз, пад адказнасьць тав. Рубэна, ужыць захады да своячасовага завозу прамысловых тавараў для прэміраваньня здатчыкаў ільнянога валакна і пянькі паводле зацьверджанага пляну і ўстанавіць самы строгі кантроль за скарыстаньнем паказаных фондаў на беспасрэднае прызначэньне.

Праз дзьве дэкады выслухаць на Камісіі Выкананьня даклады Народнага Камісарыяту Снабжэньня і Белкаапсаюзу пра выкананьне гэтай пастановы.

4 Адзначаючы, што яшчэ да гэтага часу не закончан абмалот лёну ў саўгасах Беллёнапянькасаўгастрэсту, асабліва ў саўгасе Борквічах, дзе абмалот толькі пачынаецца, абавязаць Беллёнапянькасаўгастрэст, пад адказнасьць т. Купрыянава і дырэктароў саўгасаў забясьпечыць заканчэньне абмалоту лёну ў саўгасах не пазьней 1-га сьнежня.

Даручыць Народнаму Камісарыяту Земляробства прасачыць за выкананьнем гэтай пастановы.

5. Даручыць Пракурору Рэспублікі прыцягнуць да крымінальнай адказнасьці асоб вінаватых у зрыве буда

Прагрэсыўна-прэм'яльную зьдзельшчыну на лёнаапрацоўчыя пункты

„Устанавіць такі парадак, каб апрацаваная прадукцыя неадкладна здавалася ў межах кантрактацыйных дагавароў і загатоўчых плянаў дзяржаве" (З пастановы ЦК КП(б)Б)

Прагрэсыўна-прэм'яльную зьдзельшчыну--на мяльна-трапальныя пункты

Пастанова Калегіі Народнага Камісарыяту Земляробства і Калгасцэнтру БССР

У дадатак да пастановы калегіі НКЗ і Белкалгасцэнтру ад 4 і 18 кастрычніка г. г. у мэтах узмацненьня тэмпаў апрацоўкі лёнавалакна, пянькі і прыцягненьня да гэтай работы больш калгасьнікаў і калгасьніц, калегія Наркамзему і Калгасцэнтру пастанаўляюць:

1. Абавязаць райза і райкалгассаюз у 3-тыдневы тэрмін увесьці ва ўсіх лёнаводчых калгасах БССР і калгасах, якія сеюць каноплі, натсупны парадак стымуляваньня калгасьнікаў і калгасьніц ва апрацоўку лёну і канапель:

а) Усім калгасьнікам і калгасьніцам, працаваўшым на трапаньні лёну, заразжа пасьля здачы лёнавалакна, наперад да канчатковага разрахунку дасць авансы ў лік працадзён за кожны цэнтнер трапанага валакна ад № 16 і вышэй—21 р., ад № 12 да 16—17 руб., ад № 10 да 12—14 р., ад № 8 да 10—11 руб., ад № 6 да 8—7 руб., ад № 4 да 6—4 руб.

б) Мяльшчыкам, якія працавалі на ручных мялках, выдаваць грашовы аванс у лік працадзён за цэнтнер сырцу 7 руб., пры рабоце на коннай цязе—3 руб., мэханічнай—2 руб., пры ўмове добрай якасьці валакна.

в) Сушыльшчыкам выдаваць 75 кап. на адну тону сушонай трасты.

2. Апроч гэтага, устанавіць выдачу грашовай прэміі наступным парадкам.

а) За тропаны цэнтнер лёнавалакна ад № 16 і вышэй 5 руб., ад № 12 да 16—4 руб. і ад № 10 да 12—2 руб.

б) За прыняты цэнтнер сырцу ручной мялкі, грашовай прэміі выдаецца—2 руб. і пры рабоце на коннай цязе—75 кап.

УВАГА: Якасьць (нумарнасьць) атрапанага лёнавалакна павінна адпавядаць якасьці трасты: прыкладна, 2 з пал. нумары трасты павінна даць 14-ты нумар лёну. Неабходна ў кожным калгасе вылучаць прыёмшчыка па прыёме лёну і пянькі ад трапальшчыкаў. У выпадку недобраякаснай апрацоўкі лёну і пянькі, зварачаць назад для даапрацоўкі.

3. Па мяцьці і трапаньні пянькі ўстанавіць выдачу грашовых авансаў у лік працадзён за кожны зданы цэнтнер наступным парадкам:

а) адборны гатунак—17 руб.
б) першы гатунак—15 руб.
в) другі гатунак—11 руб.
г) трэці гатунак—9 руб.

4. Апроч гэтага, за кожны прамяты цэнтнер пянькі на мяцьці, праводзіць прэм'яваньне грашыма калгасьнікаў і калгасьнікаў, якія заняты па апрацоўцы пянькі, за кожны цэнтнер наступным парадкам:

а) адборны гатунак—6 руб.
б) першы гатунак—5 руб.
в) другі гатунак—3 руб.
г) трэці гатунак—2 руб

5. Прасіць СНК прапанаваць усім за гатоўчым арганізацыям сваячасова правесьці выплату за зданыя лёнавалакно і пяньку.

6. Пацьвердзіць сваю раней шую пастанову аб тым, каб ажыцьцявіць за здачу лёнавалакна 50 проц премі ваньня выдаваліся выключна калгасьнікам і калгасьніцам, працаваўшым на апрацоўцы лёну. Распаўсюдзіць гэты пункт на калгасьнікаў і калгасьніц, працаваўшых на апрацоўцы канапель.

7. Гэту пастанову ўнесьці на зацьвярджаньне СНК.

Намесьнік наркома НКЗ Масюкоў.
Калгасцэнтр Міцькоў.

Ня толькі 70, а ўсе 100 проц. лёну апрацуем і здамо на працягу месячніка

Крупкі. Транкоўскі сельсавет уключыўся ў месячнік, абвешчаны ЦК КП(б)Б па апрацоўцы і здачы (продажы) лёну дзяржаве. Сельсавет высунуў сустрочны плян, паводле якога ён пастанавіў на працягу месячніка выканаць загатоўкі па лёну на ўсе 100 проц. На 15 лістапада па калгасах і аднаасобным сэктары сельсавету апрацавана 114 цэнт. лёнавалакна, з якіх здана дзяржаве 1 тона.

Па калгасах арганізаваны спэцыяльныя брыгады па апрацоўцы лёну.

Р. Дамінікаў.

„Пасьпеем, яшчэ зіма далёка"--так разважаюць на Віцебшчыне

Віцебск. Загатоўка лёнавалакна па раёне яшчэ не разгарнулася. На 10 лістапада плян па лёназагатоўках выканан ледзь на 10 проц.; райспажыўсаюз выканаў плян загатовак толькі на 1 проц.

Бабініцкі сельсавет загатовіў толькі 4 проц., а па цьвёрдых заданьнях з кулацка-заможных гаспадарак спагна на лёну ўсяго 1 проц. Праўя апартыісты з Бабініцкага сельсавету яўна патураюць кулацтву. Кулацтва сарвае выкананьне цьвёрдых заданьняў і сельсавет ніякіх мер ня прымае.

Замастоцкі і Машканскі сельсаветы займаюць адно з буйных месц па засеву лёну ў раёне. Сёлета каля 30 пр. усёй пасеўнай плошчы сельсавету было занята пад лёнам. Каля 60 проц. трасты па гэтых сельсаветах апрацавана ўжо, але здача лёнавалакна тармозіцца. Па Замастоцкім і Машканскім сельсаветах на 10 лістапада ня здана ніводнага кілё лёнавалакна.

Трэба адзначыць, што Замастоцкі і Машканскі сельсаветы калектывізаваны больш чым на 70 проц., асноўным элатчыкам (прадаўцом) лёнавалакна дзяржаве зьяўляецца калгас, але раённае кіраўніцтва Віцебскага Райкалгассаюзу давяло да таго, што калгасы замест прыкладнай работы дазважаюць: «пасьпеем, яшчэ зіма далёка».

Ня лепш абстаіць справа і з загатоўкамі семя. На 10 лістапада згульны плян па семя выканан толькі на 58,8 проц.

Грамадзкасьць не мабілізавана вакол пытаньня апрацоўкі і здачы лёнавалакна і семя. Насьпенныя газэты калгасу і сельсавету праяўляюць поўную бязьдзейнасьць у галіне загатовак лёну. Рабселькоры раёну не мабілізаваны на правядзеньне гэтай важнейшай гаспадарча-палітычнай кампаніі.

М. А.

Ня менш 70% лёнавалакна да 10 сьнежня 1931 г.

Загатоўка тэхкультур па БССР

Загатоўлена на 26 лістапада

Лёнавалакно	Семя	Пянька
12 проц.	47,7 проц.	1,3 проц.

Было на 21 лістапада

7,3 проц.	44,9 проц.	0,9 проц.

За „Чырвоную кнігу саветаў"

ДЭПУТАЦКІЯ ГРУПЫ

ФАБРЫК І ЗАВОДАЎ СТАЛІЦЫ ПАВІННЫ СТАЦЬ УЗОРАМ ДЛЯ УСІХ ДЭПУТАЦКІХ ГРУП БССР

Пакончыць з апартуністычнымі адносінамі

да работы дэпутацкіх груп Менску

(З МАТАР'ЯЛУ НАРАДЫ БРЫГАДЗІРАЎ)

20 лістапада пры рэдакцыі газэты «Савецкая Беларусь» адбылася нарада брыгадзіраў «С. Б.» прымацаваных да дэпутацкіх груп прадпрыемстваў гораду Менску. На нарадзе брыгадзіры інфармавалі аб рабоце дэпутацкіх груп, удзеле і дапамозе партыйных і прафсаюзных арганізацый, фабрык і заводаў у гэтай рабоце.

З інфармацый брыгадзіраў выявілася, што работа ў паасобных дэпутацкіх групах пастаўлена вельмі дрэнна. На радзе прадпрыемстваў дэпутацкія групы абсолютна не праводзяць ніякай работы. Работа дэпутацкіх груп на гэтых прадпрыемствах выпала з-пад увагу партарганізацый, па асобных партыйцы лічаць, што перш за ўсё трэба выконваць партыйную работу, а работу дэпутацкіх груп ставяць на апошнае месца.

Зусім недапушчальным зьяўляецца тое, што дэпутацкія групы г. Менску за выключэньнем груп заводу «Бальшавік» і «Камунар» яшчэ ня ўключыліся ў сацспаборніцтва за месца ў «Чырвонай кнізе саветаў». Гэтай кампаніі дэпутацкія групы не скарысталі для таго, каб ліквідаваць маючыяся прарывы і адставаньні ў рабоце асобных цэхаў і прадпрыемстваў.

Брыгадзір заводу імя Варашылава тав. Шэрафановіч гаворыць, што ня гледзячы на выклік дэпутацкай групы заводу «Бальшавік» на сацспаборніцтва за месцы ў «Чырвонай кнізе саветаў», дэпутацкая група заводу імя Варашылава да гэтага часу ў сацспаборніцтва не ўключылася. Старшыня дэпутацкай групы кажа, што зараз уключацца ў гэту кампанію няма сэнсу, бо зараз праходзяць перавыбары заўкому. Камсамольская арганізацыя заводу таксама мала аддае ўвагі рабоце групы. Сакратар камсамольскага калектыву на прапанову брыгады аб тым, каб пытаньне аб разгортваньні сацспаборніцтва за месца ў «Чырвонай кнізе саветаў» абгаварыць на бюро калектыву адказаў: «у нас ёсьць больш важныя справы». Старшыня дэпутацкай групы (партыец) брыгадзе заявіў, «што работай групы я буду цікавіцца тады, калі выканаю партыйную нагрузку».

Дэпутацкая група заводу «Варашылава» ня цікавіцца жыцьцём і працай прадпрыемства, не клапоціцца аб палепшаньні ўмоў працы, камунальным упарадкаваньні і г. д.

Брыгадзір з фабрыкі «Камуварка» тав. Кучынская гаворыць: «што на фабрыцы дэпутацкая група не працуе». Бюро складзена толькі з 2-х асоб, плян работы хоць і выпрацаваны, але-ж практычна не ажыцьцяўляецца. Дапамогі ў рабоце дэпутацкай групы ні партячэйка, ні фабком не аказваюць. Група ня цікавіцца выкананьнем прамфінпляну на фабрыцы.

Аналёгічна пастаўлена работа дэпутацкіх груп на фабрыках «Акцябр» і абутковай, на заводах «Полымя рэвалюцыі», «Беларусь», на чыгунцы і інш. прадпрыемствах г. Менску.

Але-ж там, дзе работа дэпутацкіх груп займае адпаведнае месца ва ўвазе партыйных, прафсаюзных арганізацый, якія цікавяцца работай груп і дапамагаюць ёй, там ёсьць добрыя прыклады работы. Так, на заводзе «Бальшавік» вакол дэпутацкай групы арганізавана рабочая грамадзкасьць. Работай групы штодня цікавіцца партыйны калектыў. Дэпутацкая група першая ў Менску ўключылася ў сацыялістычнае спаборніцтва за месца ў «Чырвонай кнізе саветаў». Дэпутацкая група значную работу прарабіла па камунальным упарадкаваньні і г. д. Савецкай работай на заводзе цікавяцца ня толькі дэпутаты гарсавету, але-ж усе грамадзкія арганізацыі.

Таксама пастаўлена работа дэпутацкай групы заводу «Камунар». Дэпутацкая група значную работу прарабіла ў камунальным упарадкаваньні, значна палепшыла бытавыя ўмовы рабочых і г. д. Дэпутацкая група заводу «Камунар» уключылася ў барацьбу за месца ў «Чырвонай кнізе саветаў» і выклікала на сацспаборніцтва па лепшым ажыцьцяўленьні задач выкананых таксама. Калгас «Камунар» сваячасова скончыў зяблівае ворыва і будаўніцтва хлявоў для жывёлы.

К. Кароль.

Выканаць пастановы лістападаўскага пленуму ЦК КП(б)Б

Сустрэнем сэсію ЦВК БССР з рапортам аб поўным выкананьні і перавыкананьні загатоўчых плянаў

У тэрмін і поўнасьцю выканаць загатоўкі—адна з умоў для занясеньня сельсавету ў „Чырвоную кнігу"

Сэсію ЦВК БССР сустрэнем поўным выкананьнем плянаў загатовак і мабілізацыі сродкаў

Учора на імя ЦК КП(б)Б, ЦВК СНК БССР ад праходзячага зараз пашыранага пленуму Клімавіцкага РВК атрымана наступная тэлеграма:

Пяты пашыраны пленум райвыканкому канстатуе нездавальняючы ход выкананьня плянаў збожжазагатовак. Па раёне на 20 лістапада гадавы плян збожжазагатовак выкананы на 64 проц. Пленум абвяшчае сябе мабілізаваным на поўнае выкананьне плянаў усіх відаў загатовак. Перадавы Судзілаўскі сельсавет, які выканаў гадавы плян збожжазагатовак на 117 проц., бярэ на сацыялістычны буксір адстаючы Лазавіцкі сельсавет. Пленум пасылае буксірныя брыгады ў адстаючыя сельсаветы. Арганізуючы калгасныя і бядняцка-серадняцкія масы, узмацняючы рашучы націск на кулака, даможамся 100-процантнага выкананьня пляну загатовак збожжа да 1 сьнежня, а пляны астатніх відаў загатовак—бульбы, лёна-валакна, пянькі і інш.—будуць цалкам выкананы да 10 сьнежня.

Клімавіцкі раён да часу адкрыцьця сэсіі ЦВК БССР прыдзе з поўным выкананьнем пляну загатовак і мабілізацыі сродкаў.

Прэзыдыум пленуму.

Бя ьлітасны ўдар

па канкрэтных носьбітах месьніцкіх тэндэнцый

Старобінскі райкалгассаюз за подпісам старшыні т. Крапіўка, даў дырэктыву ўсім СТФ раёну, аб тым, каб яны не здавалі таварных лішкаў збожжа дзяржаве да таго часу, пакуль ня будуць складзены збожжа - фуражныя балянсы. Гэтым райкалгассаюз фактычна выступіў супроць дырэктывы партыі аб тым, што пры складаньні збожжа-фуражнага балянсу ў першую чаргу неабходна вылучыць фонд продажу дзяржаве. Паводле дырэктывы райкалгассаюзу, ураджаі сьвінаводчых калгасаў такім чынам разьмеркаваны, што графа «продаж дзяржаве» пакінута незапоўненай.

У калгасе «Новы Быт» Міцявіцкага сельсавету, дзе разьмеркаваньне ўраджаю праводзіліся намесьнікам старшыні РКС Высоцкай, ніводнага кілё бульбы і збожжа ня вылучана для здачы дзяржаве. Нават ня здана прадукцыя па кантрактацыйных дагаворах. У гэтым-жа калгасе, дзе ўраджай «дапамагла» разьмеркаваць Высоцкая, кожная гаспадарка атрымала ня менш як 4 тоны бульбы, 2,5 цнт. пшаніцы, 1 тону жыта, 2,5 цнт. ячменю і г. д.

Калгас «Чырвоны Хлебароб» з 25 тон сабранай пшаніцы нічога не заставіў для продажу дзяржаве. А ў калгасе «Новы Шлях» дзякуючы той-жа апартуністычнай дзейнасьці райкалгасаюзу разьмеркавалі бульбу па 10 тон на гаспадарку і продаж лічаць не патрэбным.

На паседжаньні бюро РК КП(б)Б, старшыня РКС т. Краніўка абараняў гэтую апартуністычную практыку і заявіў, што «ў калгасах няма чаго брашь, а калі і ёсьць, дык яно не ўцячэ».

Асобныя партыйныя калгасныя ячэйкі ў правядзеньні загатовак бязьдзейнічаюць, спадзяюцца на самацёк. Так, парт'ячэйка калгасу «Новы Быт» на пытаньні аб загатоўках абмежавалася пастановай, якая нікога і ні чым не абавязвае. Масавая работа вакол збожжазагатовак не разгорнута. Хаты-чытальні не працуюць. Выкананьне загатоўчых плянаў па раёне ідзе выключна мэтадамі голага адміністраваньня.

Праца сярод беднаты не праводзіцца, групы беднаты пры сельсавеце не працуюць, бо парт'ячэйкі не надаюць гэтай галіне работы адпаведнай увагі.

Трэба зараз-жа замяніць апартуністычны склад Райкалгассаюзу прыцягнуўшы канкрэтных зрыўшчыкаў да адказнасьці. Трэба карэнным чынам перабудаваць усю работу па правядзеньні збожжазагатовак у Старобінскім раёне. Вакол збожжазагатовак партыйныя арганізацыі Старобінчыны павінны разгарнуць шырокую палітычна - масавую работу з тым, каб дапамагчы калгасам пасьпяхова выйсьці з прарыву, у які завяло іх апартуністычнае кіраўніцтва Старобінскага райкалгассаюзу. Месьніцкія тэндэнцыі павінны атрымаць рашучы адпор.

Ю. С.

Ударнікі збожжазагатоўчага фронту прэм'яваны

Цэлы рад калгасаў Аршанскага раёну датэрмінова і поўнасьцю выканаў гадавыя пляны збожжазагатовак. Спэцыяльная камісія пры райкалгассаюзе перадавыя калгасы, якія перавыканалі пляны збожжазагатовак да 14 гадавіны Кастрычніка, прэм'яваны, а так сама прэм'яваны, і старшыні гэтых калгасаў.

Вось гэтыя перадавікі - ударнікі збожжазагатоўчага фронту: Калгас імя Сталіна, Дубраўскага сельсавету—прэм'яваны на 400 руб. і старшыня калгасу т. Хачкоў — на 50 руб.; калгас «Новы Шлях», Туміницкага сельсавету—прэм'яваны на 200 руб. і старшыня яго на 30 руб.; калгас «1-е Мая», Панізоўскага сельсавету — на 200 руб і старшыня—на 40 руб.; калгас «Чырвоная Ніва», Баранскага сельсавету—на 200 руб. і старшыня яго на 40 руб.; калгас «Наша Атрада», Бразьдзьнянскага сельсавету — на 200 руб. і старшыня яго т. Шадашнёў—на 30 руб.; калгас «Чырвоны Араты», Нугляеўскага сельсавету — на 125 руб і старшыня яго т. Голубаў — на 25 руб.; калгас «Бальшавік», Кудаеўскага сельсавету — на 200 руб. і старшыня яго на 30 руб.; калгас «Ленінскі Шлях», Шыбенкага сельсавету — на 125 руб. і старшыня яго т. Васіяненка на 30 руб.; калгас «Ленінскі Шлях», Бразьдзечынскага сельсавету — на 200 руб.; калгас «Чырвоны Бераг», Пішчалаўскага сельсавету — на 300 руб. і старшыня яго т. Мірончык на 50 руб.; калгас «Чырвоная Горка», Веравайшанскага сельсавету — на 300 руб. і старшыня яго т. Халімановіч — на 20 руб.

Усім астатнім калгасам трэба ўзяць прыклад з гэтых калгасаў і таксама да бліцца датэрміновага выкананьня пляну збожжазагатовак.

М.

Поўнасьцю выканалі за атоўкі

Калгасы «Камунар», Гарбаціцкага сельсавету і «Чырвоны Дырыжабль», Вялікадалецкага сельсавету, Вушацкага раёну, поўнасьцю выканалі свае абавязкі перад пралетарскай дзяржавай па здачы лішкаў таварнай прадукцыі. Плян асобных відаў загатовак калгасам «Чырвоны Дырыжабль» перавыкананы. Так, ім зданы пляну здана дзяржаве 3 цэнтнэры аўсу, 1 цэнт. гароху, 2 цэнт. ячменю, 1 цэнт. вікі і 5 цэнт. буракоў. Плян мабілізацыі сродкаў гэтым калгасам выкананы таксама. Калгас «Камунар» сваячасова скончыў зяблівае ворыва і будаўніцтва хлявоў для жывёлы.

К. Кароль.

Поўнасьцю выканалі за атоўкі

Калгасы «Камунар», Гарбаціцкага сельсавету і «Чырвоны Дырыжабль», Вялікадалецкага сельсавету, Вушацкага раёну, поўнасьцю выканалі свае абавязкі перад пралетарскай дзяржавай па здачы лішкаў таварнай прадукцыі. Плян асобных відаў загатовак калгасам «Чырвоны Дырыжабль» перавыкананы. Так, ім зданы пляну здана дзяржаве 3 цэнтнэры аўсу, 1 цэнт. гароху, 2 цэнт. ячменю, 1 цэнт. вікі і 5 цэнт. буракоў. Плян мабілізацыі сродкаў гэтым калгасам выкананы таксама. Калгас «Камунар» сваячасова скончыў зяблівае ворыва і будаўніцтва хлявоў для жывёлы.

М. І. Баськo.

Сканцэнтраваць увагу парторганаў

На арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў

„Толькі на аснове шырока разгорнутай работы па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, у барацьбе з самацёкам у калгасным буд ўніцтве—будзе вырашана задача суцэльнай калектывізацыі" (З пастановы аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б)

Да справаздачна-перавыбарчай кампаніі бюро парт'ячэек поўнасьцю выканаць абавязкі перад дзяржавай у галіне збожжазагатовак

Перадавыя ячэйкі КП(б)Б Пухавіцкага раёну да справаздачна-перавыбарчай кампаніі партячэек дабіліся вялікіх дасягненьняў у калектывізацыі сельскай гаспадаркі, дасягнуўшы 75—80 проц. калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, абслугоўванай імі тэрыторыі. Асноўная задача гэтых ячэек зараз заключаецца ў тым, каб сканцэнтраваць усю ўвагу на арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў.

Пухавіцкі раён мае жывёлагадоўчы напрамак.

Рад ячэек па-бальшавіцку змагаецца за разьвіцьцё сацыялістычнай жывёлагадоўлі. Там, дзе вакол дырэктывы ЦК і СНК разгарнута баявая бальшавіцкая работа, там дасягнуты значныя посьпехі. Прыкладам гэтага зьяўляецца камуна «Зьвязда», у якой плян камплектаваньня МТФ выканан на 105 проц., а таксама поўнасьцю выканан плян сіласаваньня.

Калі за пасьпяховае выкананьне бульбазагатовак раён прэм'яваны ў суме 1.000 руб., дык па збожжазагатоўках маецца буйны прарыў. Плян збожжазагатовак выканан толькі на 45 проц. У некаторых калгасах існуюць спажывецкія настроі, якія не атрымліваюць рашучага адпору з боку партячэек. Калгасы выканалі толькі 23,1 проц. заданьня.

Патураньне ў некаторых мясцох раёну кулацка-заможным элемэнтам, якія ня выконваюць цьвёрдых заданьняў, таксама спрыяе зрыву загатовак.

Кулакі і заможныкі выканалі толькі 300 тон ці 30 проц. заданьня.

Праводзячы перавыбары бюро парторганаў пухавіцкія арганізацыі павінны дабіцца шырокай мабілізацыі ўсіх партыйцаў, каб забясьпечыць поўнае выкананьне гадавога пляну хлебазагатовак.

Брыгадзір Асака.

Папартнянская ячэйка КП(б)Б не змагаецца за гаспадарчае замацаваньне калгасаў

Значная частка калгасаў на абслугоўванай тэрыторыі Папартнянскай ячэйкі КП(б)Б, засьмечана кулацка-заможніцкімі элемэнтамі. Як напрыклад калгасы: «Перамога», «Труд», «Ударнік», «Чырвоная Вішня». Кулацка-спажывецкія настроі ў гэтых калгасах не атрымліваюць рашучага адпору з боку партячэйкі.

Калгас «Перамога» замест 60 тон бульбы, якія ён павінен здаць дзяржаве, здаў толькі 33 тоны. Калгас «Чырвоны Сьцяг» замест 64 тоны, здаў толькі... 4 тоны. Калгас «Труд» замест 70 тон здаў—28.

Праўленьне калгасу «Ударнік» давяло гаспадарку калгасу да развалу, коні ходзяць па полі ня кормленыя, у вывіку трое коняй зьбеглі невядома куды, збруя і калёсы раскіданы па ўсіх дварох. У гэтым калгасе панує абязьлічка. Зьдзельшчыны і ўліку працы ў калгасах няма, на працу выходзяць калі каму ўздумаецца.

Стары калгас «Эрштэ Май» таксама не паказвае ніякіх прыкладаў, у ім зусім адсутнічае працдысцыпліна, жанчыны на працу зусім ня выходзяць, зяблівае ворыва не праводзіцца, ня гледзячы на тое, што коні гуляюць.

Усё гэта сьведчыць аб тым, што Папартнянская партячэйка, і сельсавет, не пераключыліся на барацьбу за гаспадарча - моцны калгас, што важнейшая дырэктыва партыі імі ігнаруецца. Перавыбары партарганізацыі, масавы агляд і справаздача сельсаветаў павінны зрабіць у гэтым рашучы пералом.

Закрэўскі.

За поўную зьдзельшчыну і ўлік працы ў калгасах

Галоўнай вузлавой задачай усіх вясковых партячэек, сельсаветаў і калгасаў — ёсьць гаспадарча - арганізацыйнае ўмацаваньне існуючых калгасаў. Асновай чаго зьяўляецца правільная арганізацыя работы на грунце зьдзельшчыны, ацэненай у працаднёх, пунктуальны ўлік затрачаных працаднёў кожнага калгасьніка, — разьмеркаваньне ўраджаю выключна на аснове прынцыпу: «Хто больш і лепш працуе, той больш і атрымае».

Правядзеньне ў жыцьцё гэтых мерапрыемстваў, патрабуе ад праўленьняў калгасаў, партячэек і сельсаветаў самага актыўнага ўдзелу ў выкананьні даных партыяй і ўрадам заданьняў. Між тым па Старасельскім сельсавеце Талачынскага раёну не зьвяртаецца дастатковай увагі на гэта. Праўленьні калгасаў зусім блізарука падыйшлі да пытаньняў арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў. У некаторых калгасах «Бальшавік», «Чырвонае поле», зьдзельшчына ўведзена толькі фармальна на паперы. На сёньняшні дзень ня складзен яшчэ папярэдні плян разьмеркаваньня даходу і ўраджаю ў калгасе, а ўраджай дзеляць бяз вучоту.

Пастановы Калгасцэнтру і Наркамзему БССР аб прыкладным разьмеркаваньні прыбыткаў у калгасах, не распрацаваны. Калгасьнікі аб ёй ня ведаюць ,на сходзе пытаньне ня чыталася. Прэм'яльнага фонду пры калгасе няма. Рэўкамісія дастатковай увагі не зварочвае на даныя прарывы ў калгасе, а толькі большасьцю абмяжоўваецца агульнымі разважаньнямі. Сельсавет і мясцовая партячэйка не правяла належнай работы па папулярызацыі пастаноў Калгасцэнтру і Наркамзему аб разьмеркаваньні ўраджаю.

Партыйная ячэйка і сельсавет не разумеюць таго, што без арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасу ня могуць быць выкананы пляны хлеба і бульбазагатовак. Бездакладнае зьнішчэньне маючыхся прарываў, праваапартуністычнай стаўкі на самацёк, увядзеньне зьдзельшчыны не на словах, а на справе—вось далейшыя задачы партактыву, сельсаветаў і ў асаблівасьці праўленьняў калгасаў, якія зьяўляюцца асноўнай зарукай арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў.

Е.

КОЖНАЯ ГАЗЭТА, кожны рабселькор павінны актыўна прыняць удзел

у конкурсе „Правды"- шляхам бальшавіцкай барацьбы за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў

У Уваравічах недаацэньваюць значэньне конкурсу

Газэта „Камуніст" пераключылася ва ўсесаюзны рэйд

Бабруйск. (Па тэлеф. ад наш. кар.). Рэдакцыя газэты «Камуніст» уключаецца ва ўсесаюзны рэйд, абвешчаны ЦКК НК-РСІ СССР і рэдакцыяй газэты «Правда» па праверцы рэалізацыі 6 умоў тав. Сталіна і рашэньняў кастрычніцкага пленуму ЦК УсеКП(б). На правядзеньне рэйду мабілізавана армія рабселькораў. Рэйд працягваецца да 10 сьнежня.

Пытаньне аб уключэньні ў рэйд абгаворвалася на агульным камбінацкім (дрэваапрацоўчы камбінат) зьлёце рэдкалегій штодзённай сумесна з рэдкалегіяй камбінацкай шматтыражкі «За ўдарныя тэмпы».

Створаны штаб па кіраўніцтве рэйдам. Маршруты рэйду будуць шырока абгаворвацца на сходах зьмен і брыгад камбінату.

Рэйд прыступае да работы з 29 лістапада.

Дамброўскі.

Разгортваем масавую работу па конкурсе

У Ельскім раёне разгарнулася масавая работа па звароту «Правды» аб Усесаюзным конкурсе нізавога друку калгасна-саўгасных газэт. Ініцыятарам гэтай работы ў раёне зьяўляецца раёная газэта «Бальшавіцкі змагар».

Яна ўжо пачала практычную работу па стварэньні брыгад друку, якія разам з існуючымі пасьценгазэтамі ўключаюцца ў конкурс. 25 лістапада па ініцыятыве райгазэты ў конкурс уключыліся ўсе рабселькоры, увесь актыў ударнікаў, калгасаў увесь нізавы друк Рамезоўскага сельсавету, Ельскага раёну.

Спэцыяльна па гэтым пытаньні 25 лістапада адбылася шырокая нарада ў калгасе «Чырвоны Араты» (вёскі Шарын, Рамезоўскага сельсавету). На нараду прышлі калгасьнікі і аднаасобнікі. Увесь будынак, дзе адбывалася нарада, быў перапоўнены людзьмі. Пытаньні конкурсу выказалася да 20 чал. Усе спрэчкі былі накіраваны на пытаньні гаспадарчага замацаваньня калгасаў па сельсавеце. Тут-жа ў гэтай нарадзе быў выкрыт рад недахопаў у кіраўніцтве калгасу «Чырвоны араты». Цікава толькі тое, што аб гэтых недахопах ведалі і раней, але паколькі ня ведалі задач нізавога друку баяліся пісаць і гаварыць. Калгасьніца Драка Фёкла кажа: «я цярпела вельмі доўга. Зараз я даведалася, што друк ёсьць самраўды вострая зброя партыі. Зараз я не баюся расказаць, што ў нас на фэрме дохлі цяляты не таму, што існавала нейкая хвароба. Цяляты дохлі па 6 штук у дзень ад таго, што на ўвесь выраст цяляці выдзялялі ўсяго 3 літры малака, а ўсё астатняе малако не раганялі на масла, якое не пасылалася для рабочых цэнтраў, а разбазарвалася на месцы. Тут-жа высьвятлілася, што заможнік Рынгоўскі Нікольм, працуючы ў калгасе, падсыпаў прадпісыцыпліну калгасу і ўжо 30 дзень ня выходзіў на работу, падбухторваў і іншых калгасьнікаў, а прадукты Рынгоўскі атрымліваў як ударнік. Да пераапрацоўкі лёну ў гэтым калгасе яшчэ не прыступілі. Аб месячніку лёнаперапрацоўкі і здачы кіраўнікі ведалі, але-ж злачынна ня выконвалі пастановы партыі і ўраду. Вы крыліся такія факты, што да гэтага часу ня былі запісаны працалні жанчынам, якія працавалі па прапалачнай кампаніі. Лён калгасьнікам не выдавалі па працадніёх, а авансам. Хто колькі хацеў, той столькі і браў. Калгасьнікі даведаліся, што толькі конкурс, які мабілізуе ўвесь калгасны актыў, дасьць магчымасьць праз друк выкрыць усе злачынствы і што конкурс зьявіцца сапраўдным дапаможнікам для гаспадарчага замацаваньня калгасаў. На нарадзе была арганізавана ўдарная брыгада друку. Брыгада друку ўзяла на сябе практычную работу. З 26 лістапада прыступіць да пераапрацоўкі лёну. Увесь лён паводле пляну здаць дзяржаве. Замяніць усіх працаўнікоў па дагляду за жывёлай. Выдзяліць лепшых ударнікаў па скарыстаньні кармоў. У двухдэкадны тэрмін скончыць цялячую фэрму, якая будуецца ўжо на працягу 2-х год. Тэрмінова прыступіць да малаьбы і скончыць яе на працягу лістапада. Праз кожныя 3 дні выпускаць газэту «За сацыялістычную жывёлагадоўлю», у якой асьвятляць работу самой брыгады друку і работу кіраўнікоў калгасу. Ініцыятарам на выпуску газэты стала камсамольская ячэйка. 26 лістапада брыгада друку паслала сваіх лепшых ударнікаў у сумежны калгас «Бальшавік» Рэмізоўскага сельсавету, дзе расказала аб конкурсе «Правды» і яе задачах. Па ініцыятыве брыгады калгасу «Чырвоны Араты» у калгасе «Бальшавік» прыступілі да выпуску штодзённі. Зараз брыгада друку «Чырвоны Араты» і «Бальшавік» змагаецца за лепшую работу па гаспадарчым замацаваньні калгасу. Выходячы з практычнай работы, райгазэта стане кіраўніком усяго нізавога друку за рэалізацыю адозвы «Праўды».

Герасіменка.

Там, дзе нямі парткіраўніцтва

Уваравічы. Пастановы 2-га Усебеларускага рабселькораўскага зьезду, пастановы ЦК аб кіраўніцтве рабселькораўскім рухам павінны быць прапрапаваны кожнай партыйнай і камсамольскай ячэйкай. Кожная ячэйка павінна прыняць практычныя захады аб палепшаньні кіраўніцтва нізавым друкам, рабселькораўскім рухам і дамагчыся таго, каб у кожным калгасе, у кожным саўгасе, установе і прадпрыемстве была насьценгазэта.

У калгасах, «імя Энгельса», «Чырвоны шлях», «Чангарская дывізія» і інш. па некалькі месяцаў не выпускаюцца насьценгазэты.

Крыўская, Уваравіцкая, Саўгасная, Сялянская, Целяшоўская, Лінская, Латуцкая, Калінінская Бацуньская ячэйкі КП(б)Б нічога ня ўжылі, каб ажывіць работу рэдкалегій, каб забясьпечыць сваячасовы выпуск насьценгазэт. Больш таго, памянёныя ячэйкі КП(б)Б амаль нічога не рабілі па разгортваньні работы для арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, вытворчага замацаваньня саўгасаў. Трэба адзначыць, што ў раёне ня толькі нізавы друк (насьценгазэты) не паварнуліся тварам да арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, але і раённая газэта «Калектывіст» не разгарнула як належыць работы па конкусе «Праўды», не мабілізавала рабселькораў раёну на барацьбу за сацыялістычную жывёлагадоўлю.

Райгазэта «Калектывіст» яшчэ ня стала на чале змаганьня за разьвіцьцё сацыялістычнай жывёлагадоўлі, камплектаваньня МТФ і СТФ.

Такое становішча з адсутнасьцю рэагаваньня на рабселькораўскія допісы, адсутнічаньне масавай работы з рабселькорамі адбіваецца на ініцыятыве рабселькораў.

Зараз праходзіць конкурс «Праўды» на лепшую нізавую газэту па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні саўгасаў, калгасаў і МТС. На вялікі жаль работа па конкурсе ў раёне яшчэ не пачата. Райкому партыі, райгазэце і ячэйкам неабходна зараз-жа ўключыцца ў конкурс абвешчаны «Праўдай» і ажыцьцявіць пастановы II Усебеларускага зьезду рабсельвенкораў.

Казіміраў.

Магілеўшчына не павінна адставаць

Нізавы друк і рабселькораўскі рух па Магілеўшчыне разгорнут вельмі слабо. На многіх прадпрыемствах г. Магілеву, а таксама і па калгасах ня ўсюды маюцца насьценгазэты і рабселькораўскія брыгады (скурн. фабрыка і інш.).

Яшчэ горш абстаіць справа ў калгасах раёну, дзе аб насьценгазэтах і селькораўскіх брыгад нячутна. Асабліва дрэнна пастаўлена работа ў Навасельскім сельсавеце, у якім ні сельсавет ні партыйная ячэйка гэтым пытаньнем не займаюцца. Па сельсавеце маюцца выпадкі зажыму самакрытыкі.

Партарганізацыі Магілеўшчыны зараз у сувязі з конкурсам Ц. О. «Праўды» неабходна канкрэтна ўзяцца за разгортваньне нізавога друку і рабселькораўскага руху.

Ц. Лявіцкі

Брыгадны мэтад-лесазагатоўкам і вывазцы

„Забясьпечыць пераход да 1 сьнежня 1931 г. ня менш 75 проц. усёй занятай на лесазагатоўках і лесавывазцы рабгужсілы на брыгадны мэтад працы" (З пост. ЦК КП(б)Б)

Рагачэўскія лесарубы рапартуюць аб перавыкананьні плянаў загатоўкі і вывазкі. Да 1 сьнежня Рагачэўскі леспрамгас поўнасьцю пераходзіць на брыгадны мэтад работы

За ўдарную работу, за выкананьне і перавыкананьне плянаў загатоўкі і вывазкі, прэміяваны Рэчыцкі і Гомельскі леспрамгасы

Дэпутацкія групы, уключайцеся ў бой за „Чырвоную кнігу сацыялістычных рапартоў саветаў"

Паседжаньне Прафкамітэту зборачнага цэху дрэваапрацоўчага заводу імя Молатава

Зьнішчыць прарывы ў лясной гаспадарцы

Лясная і дрэваапрацоўчая прамысловасьць мае вялізарнейшае значэньне ва ўсёй нашай народнай гаспадарцы. Лес зьяўляецца залатым фондам крэпіны саветаў, Аднак, ня гледзячы на гэта плян IV кварталу па загатоўцы дзелавой драўніны ў БССР на 11 лістапада г. г. выкананы на 19,2 пр. і на загатоўцы дроў на 21,9 проц. Што-ж да вывазкі, дык на гэтым вучастку работы маюцца яшчэ большыя прарывы ў выкананьні плянаў. Квартальны плян па вывазцы дзелавой драўніны выкананы на 4,4 проц. і па вывазцы дроў на 5,7 проц.

Ёсьць цэлы рад леспрамгасаў і лесаўчасткаў у БССР, якія замест выкананьня плянаў сыстэматычна пагыбляюць прарывы (Плешчаніцкі, Бягомльскі, Сьмілавіцкі, Клічаўскі і інш. леспрамгасы).

Чым тлумачыць такое ганебнае недавыкананьне плянаў лесазагатовак і лесавывазкі? А тым, што як Лесбел, так і кіраўнікі паасобных леспрамгасаў яшчэ і да гэтага часу не перабудавалі сваю работу па новаму на аснове 6 умоў тав. Сталіна. Замест апэратыйнага кіраўніцтва, рашучага змаганьня за выкананьне плянаў лесазагатовак і лесавывазкі пакладаліся на самацёк. На лясных дзялянках яшчэ ў поўнай меры існуе абязьлічка, дробнабуржуазная ўраўнілаўка, цякучасьць рабочай сілы. Алсутнічае гаспадарчы разьлік, праграсыўна-прэм'яльная зьдзельшчына, няма дагавораў з калгасьнікамі аб забесьпячэньні рабочай сілай, слаба разгорнуты брыгадны мэтад працы, сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Там дзе работа сапраўды перабудавана ў адпаведнасьці з дырэктывамі партыі і ўраду, дзе ліквідавана абязьлічка, ураўнілаўка, дзе праца пераведзена на брыгадны мэтад, уведзены гаспадарчы разьлік, прэм'яльная зьдзельшчына, заключаны дагаворы з калгасьнікамі аб адыходніцтве, там плян ня толькі выконваюцца, але і перавыконваюцца. Гомельскі і Рэчыцкі леспрамгасы, якія паказалі добрыя прыклады работы ў выкананьні плянаў лесазагатовак і лесавывазкі, атрымліваюць грашовую прэмію. Прарабаўскі лесавучастак № 3 Аршанскага леспрамгасу, дзякуючы добра арганізаванай рабоце прараба тав. Шыманскага плян па загатоўцы дзелавой драўніны на 1-X г. г. выканаў на 118 проц. і на 109 проц. па загатоўцы дроў. Гэта гаворыць за тое, што нашы пляны ўпаўне рэальныя, яны могуць быць ня толькі выкананы, але і перавыкананы.

Вялікую ролю ў выкананьні плянаў лясной і дрэваапрацоўчай прамысловасьці павінны адыграць дэпутацкія групы гарадзкіх і сельскіх саветаў. Мы з усіх куткоў БССР атрымліваем рапарты аб уключэньні дэпутацкіх груп у «Чырвоную кнігу», арганізаваную газэтай «Савецкая Беларусь». Дэпутацкія групы бяруць на сябе пэўныя абавязкі ў арганізацыі працы лясной і дрэваапрацоўчай прамысловасьці.

Ніжэй мы друкуем пастанову дэпутацкай групы Бабруйскага дрэваапрацоўчага камбінату, якая ўключылася ў «Чырвоную кнігу» і ўзяла на сябе рад абавязацельстваў у выкананьні прамфінплянаў.

Трэба, каб усе астатнія дэпутацкія групы лясной і дрэваапрацоўчай прамысловасьці БССР пасьледвалі прыкладу дэпутатаў дрэваапрацоўчага камбінату, неадкладна ўключыліся ў «Чырвоную кнігу рапартоў» з тым, каб дапамагчы гаспаларнікам, партыйным і прафсаюзным арганізацыям у ажыцьцяўленьні задач, пастаўленых партыяй і ўрадам.

Кожны дэпутат на лясной дзялянцы павінен рашуча змагацца за ліквідацыю ўсіх недахопаў, якія маюцца ў рабоце. Трыкутнікі дрэваапрацоўчай прамысловасьці і лясной гаспадаркі павінны аказаць максымальную дапамогу ў рабоце дэпутацкіх груп.

Рабселькоры і нізавы друк лясной і лесаапрацоўчай прамысловасьці павінны рашуча змагацца за выкананьне плянаў лесазагатовак і лесапрацоўкі, за ажыцьцяўленьне пастаноў Чэрвеньскага пленуму ЦК УсеКП(б) і VI зьезду саветаў СССР аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў; своячасовае забясьпячэньне калгасаў лесаматар'ялямі, дравамі і г. д. У гэтым павінен дапамагчы конкурс абвешчаны ЦО нашай партыі «Праўдой».

Усе гэтыя ўмовы дадуць поўную магчымасьць выканаць і перавыканаць пляны лясной і дрэваапрацоўчай прамысловасьці 3-га рашаючага году пяцігодкі.

У Лесбеле не адчуваецца кантролю рублём

Пастановы ЦК і СНК абавязваюць Лесбел ліквідаваць запазычанасьць сялянству.

Выкананьне гэтае пастановы ўпіраецца ў адсутнасьць грошай па леспрамгасах. А грошай няма дзякуючы фінансавай недысцыплінаванасьці, заблытанай справаздачнасьці і адсутнасьці належнага ўразуменьня гаспадарчага разьліку.

Яшчэ на сёньняшні дзень шмат якія дырэктары леспрамгасаў не разумеюць кантролю рублём і недаацэньваюць вялізарнейшае ролі гаспадарчага разьліку. Запазычанасьць сялянству вялікая. А разам з гэтым, запазычанасьць леспрамгасам за зданую прадукцыю дасягае 10 мільёнаў рублёў па ўсім трэсьце.

Дзякуючы адсутнасьці фінансавага кантролю з боку самога трэсту—у мінулым складзе былога аб'яднаньня Лесбел, мы маем ганебныя выпадкі, калі за 9 месяцаў 1931 г. толькі 14 леспрамгасаў (Петрыкаўскі, Быхаўскі, Бабруйскі, Плешчаніцкі, Барысаўскі, Тураўскі, Рэчыцкі, Лельчыцкі і інш.)—пасьпелі раздаць матар'ялаў на 4 млн. рублёў у доўг.

Такую спадчыну атрымаў сучасны трэст Лесбел. Раздалі і забыліся. Многіх арганізацый даўно ня існуе і грошы вісяць у паветры.

Цяпер, у зьвязку з гаспадарчым разьлікам кліентура сама напамінае трэсту аб сваёй запазычанасьці леспрамгасам. Нядаўна прыехаў прадстаўнік Мясдрэва для разьліку за 2000 куб. мэтраў лесаматар'ялаў, аб якіх ня ведаў леспрамгас.

«Барысаўскі шпігінарны завод таксама заявіў нядаўна, што ён вінен 140 тыс. руб. і ня ведае каму плаціць. толькі таму, што заблытанае фінансавае становішча леспрамгасаў.

Становішча з вучотам такое, што ўвесь трэст на сёньняшні дзень працуе ўсьляпую. Сабекошт прадукцыі невядомы, бо ў большасьці леспрамгасаў бухгальтэрыя адстае на 3-4 месяцы. Некаторыя леспрамгасы толькі пачынаюць праводку дакумантаў першага кварталу 1931 году. Ды і зводны балянс па трэсьце ёсьць толькі на 1 студзеня 1931 г. Бухгальтэрыя не ўкамплектавана на мясцох, а ў цэнтральным апараце прадстаўлена 4 асобамі замест 18 штатных.

Становішча настолькі заблытанае, што леспрамгасы літаральна ня ведаюць што ў іх робіцца і дзе іх грошы. Красамоўна гавораць аб гэтым наступныя факты. Па 33 леспрамгасах на 1-X-31 г., па зьвестках Дзяржбанку знашлося не скарыстаных 745 тыс руб. па капіталаўкладаньнях. Калі-ж пра гэта запыталі ў саміх леспрамгасаў і прапанавалі ім скарыстаць грошы на іншыя патрэбы, дык усе адказалі, што грошы скарыстаны. Альбо яшчэ лепш. Полацкі леспрамгас меў на рахунку свайго аддзяленьня Дзяржбанку 46.000 руб. не скарыстаных па капіталаўкладаньнях. З прычыны гэтага трэст паперасіў банк перавесьці з гэтых грошай 4500 руб. Смалявіцкаму леспрамгасу. Што банк і зрабіў. Адначасова трэст дае распараджэньне Полацку аб недапушчальнасьці падобнага зьявішча і прапануе павярнуць грошы на іншыя патрэбы. У адказ Полацкі леспрамгас паведамляе, што грошай ў банку няма, яны даўно скарыстаны (??!)

Такіх прыкладаў па трэсьце можна было-б прывесьці вельмі многа.

Трэба адзначыць і тое, што сам трэст ня зможа пасьпяхова ліквідаваць падобныя зьявішчы. Лесаснабзбыт «падстаўляе яму ножку» на кожным кроку. Ня гледзячы на рад просьбаў і пратэстаў, Лесаснабзбыт працягвае адгружаць драўніну направа і налева не спагаднічы запазычанасьць. Ня відаць ніякае заклапочанасьці ў напрамку ўзьдзейнічаньня на кліентуру аб своячасовай расплаце.

Трэба Беларускім кіруючым арганізацыям прымусіць Лесаснабзбыт дапамагчы «Лесбелу» ўпарадкаваць фінансавае становішча і тым самым ліквідаваць запазычанасьць сялянству.

Брыгадзір.

Прымеце выклік

Да ўсіх рабочых, лесарубаў, возчыкаў, ІТР і супрацоўнікаў леспрамгасаў БССР

Дарагія таварышы!

Рабочая кляса СССР пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі дабілася вялізарных посьпехаў у справе сацыялістычнага будаўніцтва, кожны дзень уступаюць у працу новыя гіганты прамысловасьці, больш паловы бядняцка-серадняцкіх гаспадарак калектывізаваны, на базе суцэльнай калектывізацыі ліквідуецца кулацтва як кляса.

Гэтыя посьпехі дасягнуты дзякуючы творчаму энтузіязму рабочае клясы, дзякуючы таму, што ўводзячы новыя формы работы, праца стала справай гонару, геройства, доблесьці і славы.

Лясная прамысловасьць займае вялікае месца ў індустрыялізацыі краіны, лес патрэбен для будаўніцтва новых гігантаў, заводаў і фабрык, саўгасаў і калгасаў, лес патрэбен для забесьпячэньня прамысловасьці і пралетарскіх цэнтраў апалам, у агульным пляне экспарту лес таксама займае перазажнае месца. Між тым рад леспрамгасаў ганебна выконваюць вытворчую праграму дровалесазагатовак.

Мы, рабочыя ІТР і супрацоўнікі Рагачэўскага леспрамгасу, сабраўшыся на раённую саюзную канфэрэнцыю рапартуем, што намі гадавы плян выкананы па загатоўцы: дроў—124 пр., страявога матар'ялу—111 проц. Вывезьлі дроў—72,8 проц., строяматар'ялу—88,8 проц., па пасадцы культур увосень 224 проц., збору насеньня—114 проц., па здабычы жывіцы—63 проц.

Гэтыя посьпехі намі дасягнуты дзякуючы рэалізацыі 6 умоў тав. Сталіна.

Намі заключана 102 умовы на 6 месяцаў у сярэднім на 800 чалавек з калгасамі і калгасьнікамі на 210 чалавек, што складае 60 проц. патрэбных рабочых на 4 квартал, з іх прыступіла ўжо да працы 70 проц.

Завербавана і працуюць 125 чалавек сталых кадраў рабочых, што складае 110 проц. заданьня.

Арганізавана 11 брыгад сталых кадраў лесарубаў, 5 брыгад абозьнікаў, 5 брыгад сэзонных рабочых, мы вядзем упартую барацьбу за ахват брыгадным мэтадам усіх рабочых, абязуемся да 1 сьнежня на 100 проц. перавесьці на брыгадны мэтад работу сталых рабочых і сэзонных рабочых да 1 студзеня.

Увесь уласны транспарт пераведзен поўнасьцю на гаспадарчы разрахунак мы абязуемся да 1 студзеня арганізаваць 10 гаспадарча-разьліковых брыгад і ўсе прарабскія вучасткі перавесьці на гаспадарчы разрахунак.

ІТР абязуецца арганізаваць пры кожным рабочкоме вытворчыя гурткі па зўладаньні тэхнікай і падвышэньня кваліфікацыі рабочых лесарубаў і ніжэйшага тэхнэрсаналу.

У мэтах узмацненьня палітмасавай і выхаваўчай работы абязуемся абсталяваць пры кожным рабачкоме чырвоны куток з радыё. Ня менш 4—5 раз у месяц абслугоўваць кожны вучастак кінаперасоўкай. Выпусьць на кожнага рабочага ня менш 2 газэт, актыўна да памагаючы партыі і ўраду ў правядзёмых палітычна-гаспадарчых кампаніях.

Адзначаючы слабую работу па стварэньні бытавых умоў лесарубаў, мы абязуемся на працягу аднаго месяца адчыніць сталоўкі з разьлікам на поўны ахоп грамадзкім харчаваньнем рабочых па лесазагатоўках і, у мэтах устанаўленьня кантролю работы леспрамгасу і лесрабкопу як у раёне, так і на мясцох, вылучыць 15 сацнамесьнікаў.

Таварышы рабочыя, лесарубы, ІТР і супрацоўнікі леспрамгасаў! Выкладаючы перад вамі ўсё тое, што нам зроблена і што абязуемся у бліжэйшы час зрабіць, мы зьвяртаемся да вас з закліканам праверыць ці ўсё зроблена намі па рэалізацыі прамовы тав. Сталіна палзесяцярэце тэмпы работы па выкананьні і перавыкананьні праграмы дровалесазагатовак.

Запамятайце, што рабочая кляса чакае ад нас лесаматар'ялаў і апалу змыйце ганебную пляму, аддайце краіне сваю запазычанасьць. Лістапад і сьнежань зьяўляюцца рашаючымі месяцамі на фронце дровалесазагатовак.

Арганізуйце новыя калёны ўдарнікаў. Мабілізуйце калгасьнікаў, бедняцкую і серадняцкую на штодзённы выхад і выезд у лес, пад кіраўніцтвам кампартыі пойдзем да новых перамог на сацыялістычным фронце.

41 подпіс.

Перагледзець дагавор

У газэце «Савецкая Беларусь» быў адзначаны рад непаладкаў у рабоце сыстэмы трэсту «Лесбел» і асабліва ў рабоце лесбелаўскага транспарту, які дае арыентоўна 7 міл. руб. страт у год.

Гэта атрымліваецца таму, што заключаны дагавор з Коньбазай на пастаўку коняй, забаранне леспрамгасам самастойна набываць коняй і ўкамплектоўваць транспарт. У дагаворы паказана, што коні павінны быць ростам 1 м. 42-46 сант. па цане ў сярэднім 350 руб. за галаву. Такі галава цяпскі дагавор зрывае работу транспарту і павялічвае страты яго, бо транспарту патрэбны моцныя коні (вазакі), а ня дробныя, якія праз дзень выбываюць са строю.

Напрыклад, Полацкі леспрамгас 18 лістапада г. г. атрымаў ад Віцебскай коньбазы 30 коняй, але частку з іх трэба ўжо прадаць за 1/4 цаны, як ня годныя для транспарту.

Трэба тэрмінова перагледзець гэты дагавор і пазбавіцца ад вялікіх страт, зьвярнуць больш увагі на ўзмацненьне ўласнага транспарту леспрамгасаў добрымі коньмі і тым самым эканоміць дзяржаўныя сродкі. «Свой».

Рабочыя лесапільнага цэху заводу Д. А. імя Молатава, ідуць на перавыбары завадзкога камітэту.

Няма пералому

Даныя аб ходзе дрэвалесазагатовак на 11-XI гг. паказваюць усё яшчэ чарапашыя тэмпы.

Загатоўка будаўнічае драўніны—19,2 проц., дроў—21,9, па вывазцы будаўнічай драўніны—4,4 проц. і дроў—5,7 проц. Гэтыя лічбы сьведчаць, што на мясцох няма яшчэ на лежнага пералому.

Замест рашучага змаганьня за ажыцьцяўленьне плянаў, назіраецца яшчэ да гэтага часу разважаньне аб «нерэальнасьці» праграмы, і г. д. Там, дзе гэтага разважаньня няма, праца пастаўлена лепш і пляны выконваюцца больш пасьпяхова. Лічбы аб гэтым яскрава гавораць.

На 11 лістапада Аршанскі леспрамгас сваё заданьне па лесазагатоўках перавыканаў. Будаўнічай драўніны ён загатовіў 4519 ф. мэтр. альбо 451 проц. квартальнага заданьня, дроў—22.712 раўмэтраў, альбо 133,6 пр.

Магілеўскі леспрамгас загатовіў дроў 13.598 раўмэтраў, альбо 135 пр. заданьня і 52 проц. вывезена іх; будаўнічай драўніны—3.634 ф. м., аль бо 60 проц. Шклоўскі леспрамгас выканаў сваё заданьне па загатоўцы дроў на 257 проц.

Разам з гэтым, Плешчаніцкі леспрамгас выканаў заданьне па загатоўцы будаўнічай драўніны на 1,4 проц. і дровах на 6,1 проц. Веткаўскі леспрамгас заданьне па вывазцы будаўнічай драўніны выканаў на 203 пр. Гомельскі леспрамгас вывез 7.589 ф. м. будаўнічай драўніны (84 пр.) і 10.174 раўмэтраў дроў. У той-жа час: Бягомльскі, Смалявіцкі, Жыткавіцкі, Клімавіцкі і Прапойскі леспрамгасы па будаўнічай драўніне, а Лагойскі, Тураўскі і Буда-кашалёўскі—на дровах выканалі заданьне па вывазцы ніжэй аднаго процанту.

Лепш за ўсё выдзеліўся Вузьдзенскі леспрамгас. Ён з пачатку кварталу загатовіў усяго 467 раўмэтраў дроў, а вывез... 27 мэтраў. Па загатоўцы будаўнічай драўніны праграму выканаў на 9 проц. і вывез гэтых матар'ялаў на 0,4 проц.

Такая вялікая разьбежка ў выкананьні праграмнага заданьня па паасобных раёнах тлумачыцца алсутнасьцю непасрэднага кантролю і зацікаўленасьці мясцовых кіруючых органаў, наяўнасьцю апартуністычнай практыкі кіраўнікоў з боку некаторых леспрамгасаў і злачыннай бязьдзейнасьцю мясцовых прафарганізацый.

Лясны.

Плян лесазагатовак і вывазкі IV кварталу--пад пагрозай зрыву

ЗАСЛАЎЕ. На 10-XI—31 г. плян IV кварталу па лесазагатоўках выкананы на 7 проц. і па вывазцы на 5 проц.

Усё гэта тлумачыцца тым, што з боку паасобных сельсаветаў, а таксама і калгасаў ня зьвернута належнай увагі на выкананьне плянаў лесазагатовак.

Страшыні Старасельскага, Траскаўскага, Гатовінскага, С.-Гарадзецкага сельсаветаў імкнуцца зусім змазаць гэту справу, тлумачачы «мы ня ў сілах вынаць калгасьнікаў і аднаасобнікаў на гэту работу, бо яны нас ня слухаюць і заняты другімі кампаніямі». Кожны калгас і аднаасобны сэктар мае заключаную ўмову па лесазагатоўках з леспрамгасам, але гэтыя ўмовы застаюцца толькі на паперы. Кулацка-заможная частка ў вышэй памянёных сельсаветах цьвёрдых заданьняў па загатоўках і вывазцы ня выконвае.

Трэба рашуча пакончыць з апартуністычнай недаапэнкай, змагацца за 100 проц. і своячасовае выкананьне лесазагатовак і вывазкі.

Брыгада газ. «Сав. Бел.»:
Забаўскі, Н. Ч., Мядзьведзеў.

Раўняцца па заводзе „ДА"

Рабочыя заводу імя Молатава, пачынаючы з 25 кастрычніка, шырока разгарнулі справаздачна-перавыбарчую кампанію прафарганізацый.

Унечарговае пашыранае паседжань не заўсёку з удзелам прафактыву зьявілася пачаткам гаспадарча-палітычнай кампаніі. Уключэньне ў конкурс на лепшае правядзеньне месячніка абвешчанага беларускім рэспубліканскім камітэтам саюзу Леспрэўрабочых, распрацоўка алоэвы УсеЦСПС і інструкцыі аб перавыбарах па цэхах і зьменах, абвяшчэньне ўнутрызаводзкага конкурсу—гэта наступны этап ударнай работы.

297 дабраахвотнікаў замацавалася ў самаправераючыя брыгады, з якіх працавала 250 чал. у 18 брыгадах.

2 лістапада на заводзе адбыўся агульна-заводзкі мітынг сумесна з пад шэфнай вайсковай часткай прысьвечаны месячніку перавыбараў. На гэтым мітынгу фізкультурнікі заводу арганізавалі эстафэту на завод «Камунар», у якім удзельнічалі 45 чалавек.

16 лістапада пачаліся першыя справаздачныя сходы па цэхах. Зборачны цэх па баявому провёў справаздачны сход. Была забясьпечана на 90 проц. яўка, справаздача была стрэнута шырокай крытыкай з боку рабочых. У спрэчках выказаліся 25 чал.

Цэхавая штодзённа «За работу па новаму» цалкам уключылася ў перавыбарчую кампанію, па-бальшавіцкі мабілізавала рабочую масу.

Рост ударніцтва за час перавыбараў павялічыўся на заводзе на 60 чалавек, рост партыі—24 чал., камсамолу—32 чал., членаў саюзу—65, арганізавана 8 гаспадарча-разьліковых брыгад.

У часе выбараў асабліва праявіў сябе зборачны цэх, які забясьпечыў 95 проц. яўку рабочых.

Справаздачна-перавыбарчая кампанія праходзіла пад лёзунгам «Выкананьня і перавыкананьня прамфінплану, за ажыцьцяўленьне 6-ці ўмоў т. Сталіна».

Агранаў Міхась.

Яны заслужылі прэм'яваньня

За перавыкананьне плянаў загатоўкі і вывазкі экспартных матар'ялаў 4-га кварталу 1931 г. прэм'яваны Гомельскі і Рэчыцкі леспрамгасы. Кіраўніцтвам трэсту Лесбелу, дырэктары і іх памесьнікі т.т. Карасік, Гозман, Усхупаў, Афанасенка і Негарэвіч, прэм'яваны месячным акладам пэнсіі. Для прэм'яваньня тэхнэрсаналу і рабочых ударнікаў пераведзе на: Рэчыцкаму леспрамгасу 900 руб. і Гомельскаму 600 руб.

За перавыкананьне заданьня па вывазцы дроў для г. Менску Глускім леспрамгасам пераведзена ў распараджэньне раённых кіруючых арганізацый 300 руб. для прэм'яваньня лепшых возчыкаў. Прарабаўскі вучасткам № 3, Аршанскага леспрамгасу, пад кіраўніцтвам прараба т. Шыманскага, дзякуючы правільнай арганізацыі работы і ўкараненьня сацыялістычных мэтадаў працы — сацспаборніцтва і ўдарніцтва, перавыканаў сваё заданьне.

На 1 лістапада г. г. плян 4-га кварталу па вучастку № 3 выкананы наступным чынам: па загатоўцы будаўнічай драўніны—на 118 проц., па загатоўцы дроў—на 109 проц., па вывазцы будаўнічай драўніны—104 пр., па вывазцы апалу—на 111 проц., па экспарту—на 115 проц. і па шчанных вырабах—на 312 проц.

Адзначаючы добрасумленную работу рабочых і адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу гэтага вучастку, трэст прэм'яваў тав. Шыманскага двухмесячным акладам пэнсіі і для прэм'яваньня ўдарнікаў пераведзе леспрамгасу 1.000 руб. Адначасова з гэтым прэм'яваны сельсаветы. Маючы на ўвазе, што датэрміновае выкананьне заданьня не абышлося бяз шчырае дапамогі сельсаветаў, прапанавана дырэктарам леспрамгасу прэм'яваць старшынь і сакратароў сельсаветаў перавыканаўшых датэрміновае сваё заданьне на прарабаўскім вучастку № 3,

Т. М.

ЗАВАМІ СЛОВА

Дэпутацкія групы лесазаводаў і дзялянак, прымеце заклік бабруйскіх рабочых аб уключэньні ў барацьбу за „Чырвоную кнігу саветаў"

Уключаемся ў „Чырвоную кнігу"

Пастанова бюро дэпутацкай групы Бабруйскага Лесакамбінату імя дзесяцігодзьдзя Кастрычніка

аб уключэньні у „Чырвоную кнігу сацыялістычных рапартоў саветаў"

Заслухаўшы інфармацыю т. Хаіта аб уключэньні ў «Чырвоную кнігу саветаў» і распрацаваўшы пастановы Бабруйскага гарадзкога савету рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў аб уключэньні ў «Чырвоную кнігу саветаў», бюро дэпутацкай групы пастанаўляе:

Ухваліць ініцыятыву газэты «Савецкая Беларусь» аб арганізацыі «Чырвонай кнігі» для выкананьня вялікіх пляна сацыялістычнага будаўніцтва 5-га дзесяцігодзьдзя пяцігодкі і мабілізацыі ўсіх працоўных мас на барацьбу за генэральную лінію партыі, уключыцца ў «Чырвоную кнігу саветаў» для хутчэйшай перабудовы працы дэпутацкіх груп такім чынам, каб яна сапраўды павярнулася тварам да вытворчасьці, тварам да выкананьня ўсіх гаспадарча-палітычных задач, ажыцьцяўляючы іх праз дэпутацкія групы і ўвесь савецкі актыў на прадпрыемстве.

Бюро дэпутацкай групы камбінату бярэ на сябе наступныя самаабавязкі:

1. Мабілізаваць увесь савецкі актыў на выкананьне і перавыкананьне прамфінплану.

2. У найкарацейшы тэрмін прапрацаваць прамфінплян на 1932 г., мабілізуючы навакол гэтага ўвесь савецкі актыў.

3. Уцягнуць у рад брыгад ударнікаў усіх дэпутатаў і ўвесь савецкі актыў, уцягнуўшы іх у практычную штодзённую працу.

4. У галіне выкананьня па камбінаце самнімінуму бюро бярэ на сябе ўсе захады да палепшаньня санітарнага становішча па цэхах камбінату і выканаць пастанову СНК аб санітарным становішчы.

5. У галіне палепшаньня рабочага забесьпячэньня, грамадзкага харчаваньня і палепшаньня якасьці абедаў у сталоўцы дабіцца зьнішчэньня чаргі, хуткай прапускной здольнасьці, каб даць магчымасьці ў час абедзенага перапынку ўсім рабочым за 30 хвілін атрымаць гарачыя абеды і дабіцца палепшаньня якасьці сьнеданьня.

6. Для лепшага абслугоўваньня і сувязі з рабочымі ў начныя зьмены, з 1 сьнежня 1931 году ўстанавіць штодзённыя начныя дзяжурствы з 1 члена бюро дэпутацкай групы, 1 дэпутата і 1 сэкцыянэра.

7. Праводзіць кожную дэкаду ў плянавым парадку прыёмныя дні гарадзкога савету, для чаго правесьці адпаведную падрыхтоўчую растлумачальную работу. Першы прыёмны дзень правесьці ў канцы лістапада.

8. Правесьці рашучую барацьбу за мабілізацыю і выяўленьне ўнутраных рэзэрвсаў за памяншэньне браку, за палепшаньне якасьці прадукцыі.

9. Наладзіць сталую сувязь з гарадзкім саветам, весьці вучот прапаноў па наказу і дабіцца іх выкананьня.

10. Выклікаць на сацспаборніцтва дэпутацкія групы швэйнай фабрыкі імя «Дзяржынскага» і ўзяць на буксір дэпутацкую групу машына-будаўнічага заводу імя Сталіна.

11. Бюро дае абяцаньне ўпарта змагацца, перамагчы і выканаць узятыя на сябе самаабавязацельствы.

Старшыня дэпутацкай групы
Лесакамбінату Хаіт.
Сакратар Нісенбаум.

Загадчык зборачнага цэху зав. Д. А. Рабочы—ударнік т. Ліўшыц.

Укараніць гаспадарчы разьлік

Слуцкі леспрамгас на 28-X г. г. мае 80 проц. патрэбнай рабочай сілы і 25 проц. гужавой.

Дагаворная кампанія праходзіць здавальняюча. Заключана 90 дагавораў.

Вучасткі Слуцкага леспрамгасу павінны браць прыклад з Урэцкага леспрамгасу, які заўсёды перавыконвае свае пляны дзякуючы добра арганізаванай працы.

Гэты вучастак дамогся поўнага пераводу лесазагатоўчых работ на брыгадны мэтад працы.

Урэцкі вучастак выклікаў на сацспаборніцтва іншыя вучасткі Слуцкага леспрамгасу, паставіўшы асноўнай умовай 100 проц. выкананьне і перавыкананьне плянаў лесазагатовак і лесавывазкі, пераводу працы на брыгадны мэтад і разгортваньне паміж брыгадамі сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Трэба сказаць, што па астатніх вучастках брыгадны мэтад працы ўжываецца вельмі слаба, ударніцтва і сацспаборніцтва амаль адсутнічае.

Плян IV кварталу па Слуцкім леспрамгасе па загатоўках будаўнічага лесу выкананы на 8,9 проц., дроў—8,10 проц., па вывазцы строймматар'ялу—1,0 проц., дроў 5,5 проц.

Леспрамгас вызначыў спэцыяльныя сродкі для прэм'яваньня лепшых ударнікаў рабочых, тэхнічнага пэрсаналу і сельскіх саветаў, якія прыкладна выконваюць заданьні па загатоўках і вывазцы лесу і дроў і вядуць за сабою адстаючых.

Але на вялікі жаль Слуцкі леспрамгас да гэтага часу ні абозы, ні брыгады лесарубаў не перавёў і не пераводзіць на гаспадарчы разьлік.

Дырэктар кажа:

— «Гэта пытаньне ў нас пакуль што ў стадыі прапрацоўкі».

Райвыканком да гэтага часу не адчувае таго, што ён нясе таксама адказнасьць за выкананьне дырэктыў аб загатоўках і вывазках лесу і дроў і не зварочае ўвагі на масава-арганізацыйную працу сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў вёскі.

Слуцкі леспрамгас павінен неадкладна ўзяцца за ўвядзеньне гаспадарчага разьліку, пераводу лесарубаў на брыгадны мэтад работы.

А. Курдо.



Клуб Бабруйскага дрэваапрацоўчага камбінату пабудаваны пад кіраўніцтвам т. Кільчэўскага ў 1 месяц.

Да зьлёту ўдарнікаў фінансавага фронту

ПОЎНАСЬЦЮ АХОПІЦЬ ПАЗЫКАЙ „3-ці РАШАЮЧЫ" НОВЫХ РАБОЧЫХ У ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ

Фініш фінансавай эстафэты—5-га сьнежня—сустрэць з датэрміновым выкананьнем фінпляну 4-га кварталу

Баявым маршам да фінішу фінансавай эстафэты

Праз плянідзёнку фініш фінансавай эстафэты—Усебеларускі зьлёт ударнікаў фінансавага фронту. Зьлёт падагуліць лепшыя формы і мэтады работы, выявіць усе перашкоды, якія стаяць на шляху пасьпяховага выкананьня плану мабілізацыі сродкаў. Дэлегаты зьлёту будуць рапартаваць пралетарскай грамадзкасьці аб дасягненьнях сваіх гарадоў, раёнаў, сельсаветаў, прадпрыемстваў, калгасаў і вёсак у рабоце па мабілізацыі сродкаў.

З якім-жа выпадкам мы падыходзім да фінішу?

На 20 лістапада па БССР фінплян выкананы толькі на 48,6 проц. квартальнага пляну. Апошняя дэкада дала значнае паніжэньне паступленьняў супроць папярэдняй. Такім чынам мы не маем нарастаньня процантаў выкананьня фінпляну, якое пры падыходзе да фінішу павінна гарантаваць перамогу, а наадварот, наглядаем паніжэньне тэмпаў. Зусім зразумела, што гэтыя тэмпы не забясьпечваюць датэрміновага выкананьня квартальнага пляну, а стаяць, нават, цад пэўную пагрозу зрыву выкананьня квартальнага пляну ў цэлым.

Выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў на 20 лістапада вызначае што найбольш эдстаючым вучасткам у мабілізацыі сродкаў зьяўляюцца плацяжы на вёсцы. Не дастаткова рашучы адпор супраціўленьню і злосный агітацыі кулацтва, недаацэнка масавай работы сярод казгасьнікаў і беднякоў-сераднякоў адназасобнікаў, слабасьць і недастатковае апэрацыйнае кіраваньне справай мабілізацыі сродкаў раду фінорганаў, інэртнасьць і адсутнасьць жывой арганізацыйна-масавай работы па паасобных сыстэмах (спажыўкаапэрацыя, зямельна-калгасныя органы),—вось прычыны, якія тармозяць пасьпяховае выкананьне фінпляну на вёсцы.

Значна адстае ад пляну паступленьне абавязковых плацяжоў, зварот сельска-гаспадарчых пазык, рэалізацыя, афарміленьне і ўплата ўзносаў па падпісцы на дзяржаўныя пазыкі, уцягненьне ўкладаў у касы ашчадкасы і яўна зрываецца плян рэалізацыі акцый Трактарацэнтру і паянакапленьня ў васковай сетцы спажывецкай кааперацыі.

Вынікі работы раду гарадоў і раёнаў з усёю яскрэвасьцю паказваюць, што ёсьць усе магчымасьці ня толькі сваячасова, але і датэрмінова выканаць і перавыканаць плян IV кварталу.

Ажыўленьне ў апошнюю дэкаду арганізацыйна-масавай работы па гарадох у галіне ашчаднай справы за адну дэкаду дало больш 500 тыс. руб., альбо 25 проц. квартальнага пляну. Гэты посьпех неабходна замацаваць, парышыць, неабходна такіх-жа тэмпаў дабіцца ў галіне ашчаднай справы і на вёсцы.

Раёны і гарады, якія зразумелі важнасьць і адказнасьць задачы мабілізацыі сродкаў, якія здолелі падвесьці пад гэтую справу цьвёрдую базу арганізацыйна-масавай работы, сваячасова выконваюць плян. Тут першае месца займае чырвоншатандарная Сіроціншчына (63,8 проц.) раўняюцца па Сіроціне Жыткавічы (62,4 проц.), Хойнікі (58,4 проц.). На грунце сацыялістычнага спаборніцтва шпарка наганяюць перадавікоў Заслаўскі (58 проц.) і Лагойскі (57,6 проц.) раёны. На чале з Віцебскам (61,1 проц.), паўзровень з перадавымі раёнамі ідуць, Менск, які за апошнюю дэкаду даў 17,8 проц. квартальнага пляну, і Гомель.

Тэмпы, якія вызначаюцца па тых вучастках пляну і па тых раёнах, дзе разгортваецца жывая масавая работа, лепшы доказ рэальнасьці пастаўленай задачы датэрміновага выкананьня фінпляну, да 10 сьнежня. Гэта павінны ўлічыць, як перадавыя, так і адстаючыя раёны. Раёны—Асьвейскі, Бягомльскі, Бярэзінскі, Краснапольскі, Лоеўскі і Ўваравіцкі, выканаўшыя менш 30 проц. квартальнага пляну, зьяўляюцца галоўнымі вінаўнікамі нездавальняючага выкананьня пляну па БССР і адставаньня БССР у сацыялістычным спаборніцтве з Заходняй вобласьцю. Гэтыя раёны павінны ў самы кароткі тэрмін ліквідаваць прарыў.

Да Усебеларускага зьлёту ўдарнікаў фінансавага фронту засталася толькі адна пяцідзёнка. Фінансавы апарат, грамадзкія арганізацыі, паасобныя ўдарнікі фінансавай работы падрыхтоўку да зьлёту павінны скарыстаць у мэтах дасягненьня максымальных вынікаў па ўсіх плацяжох пляну. Перадавыя раёны і гарады павінны рапартаваць зьлёту аб поўным выкананьні пляну IV кварталу, а адстаючыя аб поўнай ліквідацыі дапушчанага прарыву.

Кожны дзень пяцідзёнкі—дзень баявога маршу да фінішу фінансавай эстафэты — Усебеларускага зьлёту ўдарнікаў фінансавага фронту.

З.

У тэрмін выканаць дадатковую рэалізацыю пазыкі „3-ці рашаючы"

Пастанова Прэзыдыуму Цэнтральнага Савету прафсаюзаў Беларусі аб дадатковай рэалізацыі пазыкі „3-ці рашаючы"

Улічваючы рост новых кадраў рабочых у нашай прамысловасьці, якія да сучаснага моманту не ахоплены падпіскай на пазыку «3-ці рашаючы год 5-годкі», а таксама зусім слабую рэалізацыю пазыкі на вёсцы, выходзячы з дадатковага заданьня БССР у суме 9 з паловаю мільёнаў рублёў, зараз разгортваецца кампанія на дадатковы ахоп рабочых, служачых і калгасьнікаў (на 7 міл. рублёў для гораду і 2 з паловаю мільёны рублёў на вёсцы) пазыкай «3-ці рашаючы».

У мэтах дадатковай рэалізацыі пазыкі, Прэзыдыум ЦСПСБ пастанаўляе:

1) Прапанаваць усім ЦП саюзаў, райгар. прафсаветам і ФЗМК абгаварыць пытаньне аб дадатковым заданьні пазыкі, вызначыўшы сумольра з райфіна і райашчадкасай канкрэтныя мерапрыемствы па разгортаньні агітмасавай работы.

2) Склікаць у 3-х дзённы тэрмін інструкцыйную нараду старшынь ФЗМК, камісій садзейнічаньня і грамадзкіх інструктароў, на якой абмеркаваць канкрэтныя мерапрыемствы па ўзмацненьні рэалізацыі пазыкі з мэтай 100 проц. ахопу на прадпрыемствах, установах, саўгасах і калгасах усіх працуючых неахопленых падпіскай і забесьпячэньне поўнага і сваячасовага паступленьня чарговых узносаў.

3) ФЗМК і камісіі садзейнічаньня шляхам вылучэньня брыгад павінны правесьці праверку як ахопленых падпіскай рабочых і служачых на кожнай фабрыцы, заводзе і ўстанове.

4) У 3-х дзённы тэрмін выявіць адстаючыя калектывы па падпісцы і накіраваць для ўзмацненьня падпіскі БУКСІРНЫЯ БРЫГАДЫ. Асаблівую ўвагу зьвярнуць на актывізацыю прадпрыемстваў, якія шэфствуюць над фінансава-крэдытным апаратам і мабілізацыі ўсёй рабочай масы гэтых прадпрыемстваў на правядзеньне паказанай работы.

5) Шляхам разгортваньня сацспаборніцтва паміж асобнымі фабрыкамі, заводамі і ўстановамі на лепшае правядзеньне падпіскі і 100 проц. ахоп рабочых і служачых з агульнай сумай падпіскі, ня менш 3-х тыднёвага заробку—арганізаваць на прадпрыемствах сустрэчныя пляны па рэалізацыі пазыкі.

6) Разгарнуць праз райпрафсаветы, шэфскія таварыствы і камсоды агітмасавую работу ў падшэфных сельсаветах, калгасах і сярод аднаасобнікаў.

7) Усю работу па рэалізацыі пазыкі ўвязаць з правядзімай фінансавай эстафэтай, арганізаваўшы сталае асьвятленьне ходу работы ў друку мясцовым, шматтыражках і насьценгазэтах, устанавіўшы чоную і чырвоную дошкі для адстаючых і перадавых ка лектываў.

8) РПС накіраваць для ўзмацненьня працы на вёсцы брыгады з складу прафактыву, камсоду і грамадзкіх інструктароў па правядзеньні гэтай кампаніі.

9) У адпаведнасьці з дырэктывамі ЦК КП(б)Б аб поўным выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў насельніцтва 4-га кварталу да 10-XII. ЦСПСБ патрабуе ад усіх райгарпрафсаветаў прыняцьця самых рашучых захадаў да хутчэйшага выкананьня вызначаных кватэрольных заданьняў.

10) Забясьпечыць каб на Усебеларускім зьлёце ўдарнікаў фінансавага фронту дэлегаты раёнаў рапартавалі аб канкрэтных мерапрыемствах па рэалізацыі пазыкі.

11) Прапанаваць усім ЦП саюзаў і райгарпрафсаветам у 3-х дзённы тэрмін забясьпечыць рэалізацыю пазыкі на 100 проц. усіх працуючых на прадпрыемствах, новабудоўлях, сэзонных рабочых, разгарнуўшы сярод іх шырокую агітмасавую работу.

12) РПС дабіцца, каб прэм'яльны фонд райашчадкас быў поўнасьцю скарыстаны для прэм'яваньня лепшых рабочых ударнікаў фінансавага фронту.

Што павінен ведаць кожны пазыкатрымальнік аб IV тыражу выйгрышаў пазыкі „Пяцігодка ў чатыры гады"

У чацьвёртым тыражы выйгрышаў пазыкі «Пяцігодка за чатыры гады» будзе разыграна 244.470 выйгрышаў на агульную суму 50.159.600 руб.

Кожная аблігацыя можа выйграць ад 200 да 5 тысяч рублёў.

Умовы, на якіх выпушчана пазыка «Пяцігодка за чатыры гады», адпаведны з умовамі 3-й пазыкі індустрыялізацыі. Таму аблігацыі 3-й пазыкі ўключаны ў пазыку «Пяцігодка за чатыры гады» і ў чарговым тыражы выйгрышаў яны ўдзельнічаюць разам з аблігацыямі пазыкі «Пяцігодка за чатыры гады».

Усе прыбыткі ад пазык аслабяняюцца ад ўсякіх падаткаў і зборaў. Процанты і выйгрышы, якія могуць выпасьць на аблігацыю, не могуць улічвацца як прыбытак для абкладаньня.

Аблігацыі дзяржаўных пазык даюць значны прыбытак. Напрыклад, трымальнікі аблігацый пазыкі «Пяцігодка за чатыры гады» атрымліваюць у год 10 руб. прыбытку на кожныя 100 руб., укладзеных у пазыку.

Па процантна выйгрышнаму выпуску трымальнікі аблігацый з кожных 160 руб. атрымліваюць 6 руб. прыбытку па купонах, якія аплачваюцца штогодна з 1-га сьнежня і 4 руб. у выглядзе выйгрышу.

За 10 год у сярэднім кожная 12-я аблігацыя процантна-выйгрышнага выпуску і кожная 5-я аблігацыя бяспроцантна-выйгрышнага выпуску будзе мець ад 200 да 5.000 руб.

З 1 сьнежня 1931 г. пачынаецца выплата прыбыткаў трымальнікаў аблігацый процантна-выйгрышнага выпуску 3-й пазыкі індустрыялізацыі і пазыкі «Пяцігодка за чатыры гады».

Па 3-й пазыцы індустрыялізацыі будзе аплачвацца купон № 2, па пазыцы «Пяцігодка за 4 гады купон № 1. Купон аплачваецца ўсімі банкамі і ашчадкасамі.

Трымальнікі аблігацый з 1 сьнежня атрымліваюць: 3 руб. за купон ад аблігацыі ў 50 руб., 1 р. 50 к. за купон ад аблігацыі ў 25 руб., і 50 к. за купон ад аблігацыі ў 5 руб.

Аблігацыя, на якую паў выйгрыш пагашаецца разам з выйгрышам. Трымальніку аблігацыі выдаецца і яе кошт, а па процантна-выйгрышнаму выпуску, акрамя таго, і процанты, якія нарасьлі да тыражу. У далейшых тыражох гэтыя аблігацыі ня ўдзельнічаюць.

П.

Тэлеграма тав. Галадзеда

адстаючым раёнам у фінэстафэце

За подпісам старшыні СНК БССР тав. Галадзеда ў адстаючыя раёны па правядзеньні фінэстафэты пасланa наступная тэлеграма.

«Старшыні райвыканкому. У выніку вашай бязьдзейнасьці плян мабілізацыі сродкаў, сарваны. Фінансавая эстафэта не скарыстана для мабілізацыі мас. Катэгарычна патрабую зьлікідаваць прарыў у выкананьні фінпляну. Папярэджаю, што за невыкананьне дырэктыў па фінпляне будзеце прыцягнуты да адказнасьці».

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

па дакладах Чэрвеньскага, Бярэзінскага, Горацкага і Прапойскага раённых выканаўчых камітэтаў аб мабілізацыі сродкаў

Выслухаўшы даклады Чэрвеньскага, Бярэзінскага, Горацкага і Прапойскага раённых выканаўчых камітэтаў аб ходзе выкананьня пляну мабілізацыі сродкаў, Савет Народных Камісараў БССР адзначае, што:

а) вынікі выкананьня пляну мабілізацыі сродкаў за тры мінулыя кварталы і тэмпы выкананьня пляну IV кварталу (на 10 лістапада выканана ў Чэрвеньскім раёне 25,7 проц., у Бярэзінскім раёне — 24,2 проц., у Горацкім — 35,1 проц.) сьведчыць аб недаацэнцы справы мабілізацыі сродкаў і невядзеньні належнай арганізацыйна-масавай рбаоты па гэтай справе ў паказаных раёнах;

б) раённыя выканаўчыя камітэты памянёных раёнаў, асабліва Чэрвеньскага і Бярэзінскага, не забясьпечылі паступленьня ў вызначаныя тэрміны аба вязковых плацяжоў і самаабкладаньня, прычым да гэтага часу не спагнаны поўнасьцю абавязковыя плацяжы з кулацкіх гаспадарак;

в) слабасьць арганізацыйна - масавай работы па выкананьні фінансавага пляну ў памянёных раёнах выявілася ў зусім недастатковых выніках рэалізацыі дзяржаўных пазычак на вёсцы (Бярэзінскі — 43,3 проц., Чэрвеньскі — 50,0 проц.), у нездавальняючым выкананьні пляну па ўкладах ў касы ашчаднасьці (Бярэзінскі раён), у недапушчальна слабай рэалізацыі акцый Трактарацэнтру (Бярэзінскі раён —4,1 проц., Горацкі — 5,9 проц., Прапойскі — 5,7 проц і Чэрвеньскі—12,0 проц. квартальнага пляну) і ў невыкананьні пляну паянакапленьня па спажывецкай кааперацыі (Бярэзінскі раён — 16,4 проц., Прапойскі — 20,3 процанты, Чэрвеньскі—6,7 проц.);

г) пры значным недавыкананьні пляну таваразвароту асабліва ў кастрычніку (за кастрычнік выканана ў Чэрвеньскім раёне 10,5 проц., Бярэзінскім —18,0 проц., Прапойскім—17,6 процантаў і Горацкім—16,3 проц. квартальнага пляну), фактычная астача тавару значна перавышае ўстаноўленыя ліміты.

Выходзячы з паказанага, Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Абавязаць Бярэзінскі, Чэрвеньскі і Горацкі раённыя выканаўчыя камітэты, пад асабістую адказнасьць старшынь раённых выканаўчых камітэтаў і загадчыкаў раённых фінансавых аддзелаў, ліквідаваць фінансавы прарыў праз наладжаньне чоткай і клясава-вытрыманай работы раённага апарату і сельскіх саветаў і праз шырокую мабілізацыю грамадзкасьці, усямерна скарыстаўшы ў гэтым кірунку фінансавую эстафэту.

Прапанаваць Прапойскаму раённаму выканаўчаму камітэту забясьпечыць поўнае і датэрміновае выкананьне пляну IV кварталу на аснове дасягнутага становішча пералому і яшчэ больш разгарнуць масавую работу.

2. Прапанаваць Бярэзінскаму, Чэрвеньскаму, Горацкаму і Прапойскаму раённым выканаўчым камітэтам неадкладна спагнаць усе абавязковыя плацяжы з кулацкіх гаспадарак.

3. Абавязаць раённыя выканаўчыя камітэты і загадчыкаў раённых фінансавых аддзелаў памянёных раёнаў забясьпечыць сыстэматычную масавую работу па пытаньнях выкананьня фінансавага пляну. Зьвярнуць асаблівую ўвагу раённых выканаўчых камітэтаў і загадчыкаў раённых фінансавых аддзелаў на тое, што поўнае і сыстэматычнае, з дэкаду ў дэкаду, выкананьне фінпляну магчыма на аснове мабілізацыі шырокіх рабоча - калгасных мас вакол фінансавага апарату, уцягненьня іх у актыўную работу па выкананьні фінпляну, актывізацыі ў гэтым кірунку ўсяго савецкага апарату, камісій дапамогі і фінансавых сэкцый і што толькі пры гэтай умове можа быць выканан плян мабілізацыі сродкаў па дабравольных плацяжох (дзяржаўная пазычка, уклады ў ашчадныя касы і рэалізацыя акцый Трактарацэнтру).

4. Для вызваленьня сродкаў дзяржаўнага крэдыту з таваразвароту, аба вязаць Бярэзінскі, Чэрвеньскі, Горацкі і Прапойскі раённыя выканаўчыя камітэты, неадкладна праверыць работу спажывецкай кааперацыі, ужыўшы ўсе захады да выкананьня пляну таваразвароту, прывядзеньня тавараных астач да нармальных дырэктыўных разьмераў і поўнага выкананьня пляну паянакапленьня.

5. Пытаньне аб рабоце раённых выканаўчых камітэтаў і фінансавага апарату Бярэзінскага і Чэрвеньскага раёнаў па выкананьні фінансавага пляну абмеркаваць у залежнасьці ад вынікаў выкананьня пляну на 10 сьнежня.

Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Фінансаў далажыць Савету Народных Камісараў аб выніках выкананьня пляну па гэтых раёнах па становішчы на 10 сьнежня, а старшыням памянёных раённых выканаўчых камітэтаў паведаміць СНК аб выніках выкананьня пляну на 10 сьнежня.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР А. Калнін.
Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР С. Кандыбовіч.
26 лістапада 1931 г.
г. Менск.

Слова ў спрэчках

(Матар'ял да канфэрэнцыі МенАПП)

Канфэрэнцыя МенАПП склікаецца ў час, калі на літаратурным фронце БССР адбываецца досыць акрэсьлены пералом. Значная частка спадарожнікаў адкідае свае ранейшыя ўстаноўкі на нашу рэчаіснасьць, перабудоўваецца і паступова пераходзіць у стан саюзьнікаў пралетарскай літаратуры. Гэта характарызуюць апошнія творы Кузьмы Чорнага («Вясна»), «Бацькаўшчына» і рад дробных апавяданьняў, надрукаваных у «Чырвонай Беларусі» і «Чырвонай Зьмене»), аповесьць унутры белапаўскага спадарожніка Б. Мікуліча — «Наша сонца» і рад інш.

Другім момантам, які характарызуе пералом у беларускай пралетарскай літаратуры зьяўляецца тое, што на сёньняшні дзень ужо ідзе ў літаратуру ўдарнік непасрэдна з вытворчасьці. Літаратура становіцца справай не адасобленай групкі людзей. Словы Ўладзімера Ільліча Леніна. «літаратурная справа павінна стаць часткай агульна-пралетарскай справы». — сёньня настойліва і ўпарта праводзіцца ў жыцьцё. У гэтай справе беларуская пралетарская літаратура мае дадатныя вынікі. Рабочыя Менскага заводу імя Варашылава Лейбман і Малашэнка выдалі першую сваю кніжку пра барацьбу заводзкіх арганізацый за палепшаньне грамадзкага харчаваньня — «Новы цэх варашылаўцаў». На гэтым-жа заводзе маюцца такія таварышы, як Нортман, Камянецкі, Шаўцоў, якія даюць ня дрэнныя вершы і нарысы з барацьбы рабочых за выкананьне свайго прамфінпляну. Вылучаюць сваіх паэтаў і пісьменьнікаў і іншыя менскія заводы: «Камунар» — Коршак, «Дрэваапрацоўшчык» —Бацюшкоў, Швэйная фабрыка імя Кім — Мацієўская, завод «Ударнік»—Яфімава, Гарбачэнка і інш. Зараз выходзіць у сьвет другая, больш значнамерам, калектыўная мастацкая кніжка рабочых—ударнікаў.

Сёлета МенАПП'ам была праведзена вялікая масавая грамадзкая праца. Было накіравана шмат пісьменьніцкіх брыгад на заводы і ў калгасы, дзе яны ўключаліся ў непасрэдную барацьбу за выкананьне плянаў. Брыгады працавалі на Добруская папяровай фабрыцы «Герой працы», на Гомсельмашы, на Бабруйскім дрэваапрацоўчым камбінаце і г. д.

Мен. АПП'ам зьвернута ўвага на паказ у мастацкай літаратуры камсамолу на рыштаваньнях будаўніцтва. Заключана сацыялістычная ўмова паміж МенАПП'ам і Менскім гаркомам, дзе камсамол абавязаўся вылучыць сваіх лепшых таварышоў у літаратуру, дапамагчы пралетарскай літаратуры стварыць камсамольскую тэматыку. Аднак, на вялікі жаль, прыходзіцца канстатаваць нядбайныя адносіны да выкананьня гэтай умовы з боку некаторых камсамольскіх калектываў. Так, на заводзе «Камунар» яшчэ і да гэтага часу справа закліку ўдарнікаў у літаратуру не пастаўлена на належную вышыню. Заняткі гуртка пачынаючых з восені г. г. 6 разоў былі сарваны па віне заводзкіх арганізацый. Плян працы гуртка ня ўнесены ў плян працы камсамольскага калектыву. Амаль такое-ж самае становішча з плянам працы літаратурнага гуртка наглядалася да лістапада месяца і на заводзе імя «Варашылава. Зусім дрэнна пастаўлена справа закліку ўдарнікаў у літаратуру на чыгунцы.

Наглядаюцца нядбайныя адносіны да закліку і з боку некаторых таварышоў Мен. АПП'аўцаў (Пфляўмбаум, Маракоў В., Казлоўскі, Ананьеў). Створаная кансультацыя для пачынаючых ударнікаў пры Мен. АПП'е не працуе.

Некалькі слоў пра Менскую цэнтральную рабочую літаратурную студыю. Ня гледзячы на спэцыяльную па станову Мен. АПП'у, дзе яскрава адзначана, што студыя зьяўляецца асноўным рэзэрвам папаўненьня менапаўскіх радоў, асноўнаю школаю для закліканьня ўдарнікаў у літаратуру—да гэтага часу яшчэ канчаткова ня вытраўлены неэтычныя, дэзарганізуючыя адносіны з боку паасобных менапаўцаў да студыі. Гэта выяўляецца ў тым, што некаторыя менапаўцы пры разглядзе творчасьці больш выяўленых творча студыйцаў, замест дзелавой крытыкі, проста кажучы, зьдзекуюцца, займаюцца літаратурным шарлатанствам. Гэтыя «наскокічы» ў крытыцы ідуць па лініі аднабаковага разгляду студыйскай творчасьці. Яны заўважаюць паасобныя хібы ў маладых аўтараў, якія (хібы) непазьбежны пры літаратурным росьце. Выпукляюць іх перад грамадзкасьцю, даводзячы, што студыя не спраўляецца са сваёй задачай. На справе гэта ня так.

У 1931 годзе студыяй выхаваны цэлы рад таварышоў і перададзены ў Бел. АПП і аб'яднаньне пралетарскага калгасных пісьменьнікаў. Супроць такіх адносін да студыі трэба павесьці самую рашучую барацьбу. Студыя павінна зьявіцца асноўнай школай для закліканых ударнікаў у літаратуру і яна павінна існаваць.

Яшчэ зараз прыходзіцца канстатаваць адсутнасьць творчых груповак пры Мен. АПП'е. У пачатку 1931 году была створана такая адна групоўка—«Ударны пост», у якую ўваходзілі Ю. Таўбін, Зьм. Астапенка, А. Куляшоў, Б. Мікуліч, С. Шушкевіч, В. Маракоў, і якая дала нядрэнныя вынікі ў сваёй працы. На паседжаньнях «ударнага паста» заслухоўваліся творчыя справаздачы кожнага таварыша, што справаздачы магчымасьць дэтальна прааналізаваць яго творчасьць і даць належныя напрамак у далейшай працы. Гэтае пытаньне канфэрэнцыя павінна ўзьняць на належную прынцыпова-палітычную вышыню.

Разам з пытаньнямі арганізацыі творчых груповак, мы завастраем увагу канфэрэнцыі на бязьдзейнасьці паасобных жанравых сэкцый, як сэкцыі нарысу і драматургіі — гэтых вузкіх месц у беларускай пралетарскай літаратуры.

Мен. АПП зусім мала робіць у справе стварэньня новага тыпу пісьменьніка, які-б быў арганічна зьвязаны з будаўніцтвам нашага сёньня. У нас яшчэ няма сталага прымацаваньня пісьменьнікаў да пэўнага цэху, да пэўнага ўдарніка, закліканага ў літаратуру. Аб гэтым патрэбна сур'ёзна пагаварыць на канфэрэнцыі і вынесьці адпаведныя рашэньні. Стварэньне новага тыпу пісьменьніка — цэнтральная задача ўсёй пралетарскай і савецкай літаратуры.

Трэба з бальшавіцкай рашучасьцю прызнаць той факт, што Мен. АПП зусім мала аддае ўвагі паказу героя ў цітодкі. На сёньняшні дзень няма сталага прадуманага твору на гэтую тэму. Праўда, ёсьць спробы паасобных таварышоў аддаць даніну гэтай справе ў выглядзе невялічкіх нарысаў, над звычайна схэматычных, насьпех напісаных, нарысы Скрыгана, Знаёмага і інш.).

Канфэрэнцыя ў сваёй працы павінна зьвярнуць найасаблівую ўвагу на ўсе пытаньні, закранутыя ў гэтым артыкуле па дзелавому вырашэньню іх і ў далейшым павесьці бальшавіцкую барацьбу за іх пасьпяховае правядзеньне ў жыцьцё. У гэтым—парука новых перамог.

Т. Алесін, З. Віталіч.

Пастанова Эканамічнага Савету БССР

Пра скарыстаньне механізмаў па працаёмістых работах

Востры недахоп рабочай сілы для важнейшых галін народнай гаспадаркі высоўвае, як цэнтральную задачу, максымальную мэханізацыю найбольш цяжкіх і працаёмістых працэсаў і тэхнічнае ўзбраеньне працы ў гэтых галінах народнай гаспадаркі (лес, торф, будаўніцтва і інш.) «Мэханізацыя працэсаў працы зьяўляецца той новай для нас і рашаючай сілай, без якой немагчыма вытрымаць ні нашых тэмпаў, ні новых маштабаў вытворчасьці» (Сталін).

Ня гледзячы на гэта ў радзе галін народнай гаспадаркі БССР мэханізацыя і тэхнічнае ўзбраеньне працы па найбольш працаёмістых работах ня толькі не фарсыруецца, але нават наглядаецца няпоўнае скарыстаньне мэханізмаў, недастатковае правядзеньне самых простых мерапрыемстваў па мэханізацыі: працы, неналаджанасьць вучоту наяўнасьці мэханізмаў на работах і эфэктыўнасьці іх працы (па торфу з 2-х торфазьбіралак працуе толькі 1, з 18 фразэраў—ніводзін не працаваў, прастоі фармовачных машын на 13-ці заводах хістаюцца ад 23,6 проц. («Кастрычнік») да 43 проц. («Сьцяг сацыялізму»); вузкакалейка на заводзе «Міханавічы» пабудавана толькі на 10 проц., лежневая дарога на заводзе «Калектыўная Праца» пабудавана на 50 проц., на заводзе імя «Даўмана»—не вядзецца вучот працяжнасьці і парку па шырока-калейнай і лежневай дарогах. 26 мэханічных піл «ЭРКО», якія ёсьць на лесазагатоўках, з тае прычыны, што няма запасных частак, не працуюць 2-гі год; запрактываныя па Лесбелу 120 кілём. лежневых дарог пабудаваны толькі на 39 проц.; зусім не мэханізаваны сплаўныя работы. Па Галоўдартрансу з 27 камнедрабілак працуюць 15, з 56 каткоў працуюць 34, з 220 аўтамашын—175, з 101 трактароў—65, транспарцёры скарыстоўваюцца на 30 проц.).

Не вялася навукова-дасьледчая работа па вывучэньні эфэктыўнасьці мэханізмаў, па вывучэньні новых мэтадаў мэханізацыі (асабліва простых, якія не патрабуюць складаных мэханізмаў і дэфіцытных матэрыялаў), па стандартызацыі мэханізмаў.

Выходзячы з паказанага і для далейшага фарсыраваньня мэханізацыі працаёмістых работ, асабліва ў сэзонных галінах народнай гаспадаркі, найбольш плянавай і рацыянальнай пастаноўкі скарыстаньня мэханізмаў і правільнага іх разьмеркаваньня і пераразьмеркаваньня, Эканамічны Савет БССР пастанаўляе:

1. Прапанаваць Дзяржплану, ВСНГ, Народнаму Камісарыяту Працы, Лесбелу, Галоўдартрансу і будаўнічым арганізацыям пры складаньні народна-гаспадарчага пляну на 1932 г. прадугледзець беззагаворачнае скарыстаньне мэханізмаў і фарсываць мэханізацыю і тэхнічнае ўзбраеньне працы ў найбольш працаёмістых працэсах вытворчасьці, асабліва ў сэзонных галінах народнае гаспадаркі, як:

а) па лесе—мэханізацыю вывазкі (будаваньне лежневых і пераносных вузкакалеек, трактарная цяга), мэханізацыю вырабу шпал, гонтаў, клёпак, дранц і мэханізацыю сплаўных работ і інш.;

б) па дарожным будаўніцтве—мэханізацыю грабарных работ, здабычы жвіру і пяску, разьбіўкі шчэбня і каменьня і г. д.;

в) па торфу—мэханізацыю здабычы (фрэзэрная, гідра-торф), уборкі, транспартаваньня і вывазкі здабытага торфу;

г) па будаўніцтве—мэханізацыю падачы матар'ялаў, стандартызацыю сталярных работ, мэханізацыю расьпілоўкі і загатоўкі лесаматар'ялаў, асабліва для масавага адпатыпнага будаўніцтва.

2. Прапанаваць ўпаўнаважанаму Трактарацэнтру і Галоўдартрансу да 1 студзеня 1932 г. распрацаваць пытаньне аб скарыстаньні трактарнага парку ў зімовы час для вывазкі лесу, камня і торфу.

Прапанаваць Лесбелу і Белторфу ў 2-х дэкадны тэрмін падаць свае заяўкі ў Дзяржплян па мэханізацыі транспарту.

3. Абавязаць гаспадарчыя арганізацыі пашырыць сетку рамонтных майстэрняў і перасоавачных рамонтных брыгад для сваячасовага і бесьперабойнага рамонту мэханізмаў і забясьпечыць сваячасова папаўненьне парку запаснымі дэталямі.

Арганізаваць майстэрні для масавага вырабу простых мэханізмаў.

4. Даручыць Дзяржплану разглядаць пытаньні аб забесьпячэньні асобных галін народнай гаспадаркі мэханізмамі, разьмеркаваньні і пераразьмеркаваньні мэханізмаў паміж паасобнымі гаспадарчымі арганізацыямі і распрацоўку мерапрыемстваў для далейшага фарсыраваньня і ўкараненьня мэханізацыі.

5 Прапанаваць ВСНГ, Галоўдартрансу і гаспадарчым арганізацыям мець сталы нагляд за тым, як скарыстоўваюцца мэханізмы

6. Даручыць навукова - дасьледчым інстытутам прамысловасьці і ахоны працы ўключыць у праграму сваёй дасьледчай работы вывучэньне пытаньняў укараненьня мэханізацыі ў асобных галінах народнай гаспадаркі і эфэктыўнасьці работы па мэханізацыі.

Старшыня Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР М. Галадзед.
Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР С. Кандыбовіч.
21 лістапада 1931 г.
г. Менск.

АПАВЯШЧЭНЬНЕ

«У зьвязку з падрыхтоўкай парт. нарады па пытаньнях мастацтва МК і Дырэкцыя Першага Беларускага тэатру праводзяць конфэрэнцыю—дыспут 30-га лістапада г. г.

Парадак канфэрэнцыі:

1. Шляхі разьвіцьця тэатру (даклад т. Бабарыкіна),—саклад галоўнага рэжысэра тав. Крэпуска.
2. Мастацкая частка.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА. Пачатак а 6, 7-20, 10-30 каса з 1 дня. Амэрыканскі фільм Боязьнь жанчыны

КІНО ТЭАТ КУЛЬТУРА. Пач. а 7, 8-45 10-30. Каса ад 5 г. Кінаповесьць Свой хлопец. Звыш праграмы Шахматная арачка і Хроніка № 21

КІНО ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ. Пач. 3-30, 6, 7-30, 9 і 10-30. Каса ад 12 г. КАМЭДЫЯ Шчасьлівыя коньцы. Звыш праграмы Нарыс Саюзкіно № 10

КІНО ПРАЛЕТАРЫ. Пачатак а 7 гадзе. Пач. Па заводах у карціне Знатныя падарожнікі. Звыш праграмы Хроніка

Хатаўнянскаму броварy ПАТРАБУЕЦЦА ВОПЫТНЫ ШОФЭР са стажам. АПЛАТА ПА ЗГОДЗЕ. Будуць дадзены камунальныя паслугі. Жадаючых просім зьявіцца асабіста, або накіраваць заяву па адрасе Журавічы, Хатаўнянскаму броварy завода кіраўніцтву. Заводаўпраўленьне.

Нарсуд Койданаўскага раёну абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне Карповічу Мікалаю жыхару м. Койданава.

Рэдакцыя газэты „Савецкая Беларусь" і Менскі Гарадзкі Савет

СКЛІКАЮЦЬ НАРАДУ

па пытаньні ходу выкананьня фінпляну 4-га кварталу па гораду Менску.

На нараду выклікаюцца гарадзкі штаб фінансавай эстафэты, бюро фінбанкаўскай сэкцыі гарсавету і яе актыў, гарадзкі камітэт садзейнічаньня, праўленьне саюзу фінбанкаўскіх работнікаў, кіраўнікі фінбанкаўскіх установаў (Гарбанк, Фі адзелы, ашчадкаса), брыгадзіры прымацаваныя да дэпутацкіх груп, гарпрафсавет, завод каласы «В рашылава», „Камунар", „Більшавік", чыгункі, старшыні дэпутацкіх груп, прадстаўнікі ЦРК, гаржыльаддзелу, райспажыўсаюзу, ТПО і камісіі садзейнічаньні т. т. Вадсон, Бамбі, Лазарчык, Шапашнікаў. Запрашаецца прадстаўнік НКФ БССР.

Нарада адбудзецца 30-га лістапада а 6 гадзіне ўвечары ў памяшканьні рэдакцыі газ. Савецкая Беларусь".

Барысаўскае Міжраённае Аддзяленьне БЕЛСЕЛЬГАССНАБЖЭНЬНЯ

АБВЯШЧАЕ, што з 20 лістапада 1931 г.

АДЧЫНІЛА СВАЮ ДЗЕЙНАСЬЦЬ

па снабжэньні сельскай гаспадаркі сельска-гаспадарчымі машынамі і іншымі сродкамі сельска-гаспадарчай вытворчасьці

Барысаўскага, Бягомльскага, Пушчанскага, Крупскага і Бярэзінскага раёнаў

АДРАС канторы і складу аддзяленьня: Новы Барысаў, вул. Пролетарская, пераезду (Чыгуначны пераезд).

БЯГУЧЫ РАХУНАК: у Барысаўскім Аддзяленьні Дзяржбанку № 61-...

Для тэлеграм: Нов.-Барысаў, Белсельгассн...

Заг. Барысаўскага Р... СКАКУН.

Заг. Канторы Барысаўскага Міжраённага Аддзяленьня Белсельгассн...

ПАСТАНОВА НАРОДНАГА КАМІСАРЫЯТУ ПРАЦЫ БССР

23-га лістапада 1931 г. № 51. гор. Менск.

Пра ўзмацненьне нагляду за правільнай аплатай работнікаў дзяржаўнага кіраўнічага апарату, прадпрыемстваў і ўстаноў.

Сярод VI з'езду тав. Сталіна вялікае месца займае пытаньне аб упаракаваньні тарыфнай сыстэмы з тым, каб зьнішчыць дробна ўраўнялаўку ў аплаце працы. Гэтае мерапрыемства павінна быць аж